Іван Стома

# Па жывых сьлядах даўно памерлых продкаў

Палявыя нататкі капача



Іван Стома

# Па жывых сьлядах даўно памерлых продкаў

Палявыя нататкі капача

Полацак
Выдавецкая ініцыятыва «Полацкае ляда»
2017

УДК 821.161.3-3
ББК 84(Беи)
С81

Дзякуем за дапамогу ў выданьні кнігі
**Ірыне Мілеўскай**.

**Стома І.**
С81 Па жывых сьлядах даўно памерлых продкаў : палявыя нататкі капача / Іван Стома. — Полацак : Выдавецкая ініцыятыва «Полацкае ляда», 2017. — 140 с.

Напрыканцы 90-х хлопчыка Ваню, будучага аўтара гэтай кнігі, у Полацку ведалі ўсе, хто цікавіўся гісторыяй або ўвогуле культурай роднага гораду. Яго можна было пабачыць на археалягічных раскопках, на сустрэчах з пісьменьнікамі і гісторыкамі, побач з будаўнікамі, якія рэстаўравалі карпусы Езуіцкага калегіюму. Аднак звычайна з самай раніцы, калі ня трэба было ісьці ў школу, ён вандраваў па жывых сьлядах даўно памерлых продкаў побач з Замкавай гарой. У дванаццаць гадоў ён трапіў у полацкія лёхі. Гэты хлопчык у старэйшых клясах ужо меў энцыкляпэдычныя веды па гісторыі роднага краю. І ня дзіўна, што так рана набыты жыцьцёвы досьвед запатрабаваў мастацкага асэнсаваньня.

© Стома І., 2017

## УСТУП

Калі Алесь Аркуш прапанаваў мне напісаць мастацкі твор, кшталту ўспамінаў полацкага пошукаўца старажытнасьцяў, я ня стаў адмаўляцца ад гэтай ідэі. Такая думка, нават фрагмэнты будучага тэксту, нейкія разважаньні, успаміны даўно круціліся ў галаве. Тут цяжкасьцяў не было. Але замахвацца на напісаньне твору, па-першае, я не хацеў з добрых, зразумелых і вядомых усім прычынаў, па-другое, мае прынцыпы — ісьці сваім шляхам, быць гэткім «адасобленікам» і з тае прычыны не высоўвацца, ня лезьці ў «звычайны сьвет», таксама мяне стрымлівалі. Я не зьбіраўся ім здраджваць. Была й яшчэ адна акалічнасьць. Жыцьцёвы шлях адэкватнай асобы ня можа быць наўпростым і паліраваным, таму цьвердалобасьць на такім шляху не вітаецца. Паліраваны, просты жолаб замест шляху — лёс дурня, таму лепш мець цьвёрды паліраваны лоб. У дурняў усё проста, і ім заўсёды шанцуе. Але нават такая пастаноўка пытаньня чамусьці не падахвочвала мяне да дзеяньня. Таму трэба прызнаць, што спадар Аркуш калі не адзін з суаўтараў, дык адзін з натхняльнікаў гэтага твору.

Ніхто, нават з полацкіх калегаў па рыдлёўцы, мне пра падобнае не казаў і ня раіў, прытым шмат хто здымае відэа ці нават фільмы пра свае прыгоды альбо марыць гэтым

заняцца. Хаця па сабе ведаю, што наш брат ня схільны да балбатлівасьці...

Другое пытаньне, якое паўстала пасьля рашэньня такі тэкст напісаць, — у якім стылі гэта рабіць: мэмуары, мастацкая аповесьць... Тут гэта не падыдзе. Папускаць румы: колькі я страціў, што атрымаў наўзамен, як было цяжка — для такога твору катэгарычна непрымальна. Бліжэй — расповед. Шчыры расповед у сваім коле атачэньня, дзе прысутнічаюць некалькі пабочных асобаў, нават дакладней — размова. Так-так, размова з тым чалавекам, які можа зразумець. Хутчэй нават маналог. Я не зьбіраюся нікога навучаць — мой шлях проста адзін са шматлікіх, які ня варта ацэньваць з пазыцыі карысьці, сэнсу і выгоды. Хаця не бывае бескарысных дзеяньняў, бываюць незаўважныя і неасэнсаваныя.

Вы ўжо прыкмецілі наяўнасьць ва ўступе працяжнікаў і шматкроп'яў? Спэцыфічнасьць тэмы, яе асаблівасьці, немагчымасьць перадаць звычайным расповедам думкі і пачуцьці вымушаюць да падобнай пунктуацыі. Як, напрыклад, растлумачыць «адчуваньне вайны», «адчуваньне старажытнасьці», «польскія» ці «савецкія» адчуваньні ад наведваньня вёсак у Заходняй Беларусі, пачуцьці ад знойдзеных артэфактаў з баявых пазыцый у глухім лесе?

Я распавяду не пра ўсе выпадкі і сытуацыі са сваёй спэцыфічнай біяграфіі. Некаторыя зь іх былі проста замацаваньнем пройдзе-

нага і, нягледзячы на зыркасьць, не нясуць нейкай істотнай інфармацыі. Пра некаторыя, па розных прычынах, не хочацца распавядаць. Гэта не пратакол допыту і ня споведзь, апраўдвацца я ні перад кім ня буду.

І галоўнае. Ва ўсім, што я пішу, няма нічога новага. Усе тыя рэчы, пра якія тут распавядаецца, апісаныя ўжо шмат разоў, у розных творах рознай тэматыкі, накіраванасьці ды стылістыкі. Мастакі, творцы Сярэднявечча і Адраджэньня, нездарма лічылі: усё, што імі ствараецца, толькі водгалас, рэха таго, што ўжо было, і стаіць спаконвечная задача — пачуць тое рэха і пераказаць нашчадкам.

Таму я вырашыў па магчымасьці пазбегнуць цытат, ня трэба іх, якімі б трапнымі яны ні былі: інакш болей чым паўтвору складалася б зь іх, хаця... Ат, Бог зь ім! Новым будзе толькі мой асабісты погляд на падзеі, мой стыль расповеду.

Такім чынам, варта пра гэта ўсё ж сказаць, ключ да гэтага твору — ва ўступе. Калі гэтая кніга ня будзе прачытаная адным дыхам, вяртаньне да чытаньня я раю пачынаць зноў зь першых абзацаў.

## ЯК Я КАНЧАТКОВА НАРАДЗІЎСЯ

Раддом, у якім я зьявіўся на сьвет, месьціцца ў Наваполацку. Да свайго зьяўленьня на белы сьвет і адразу пасьля я бавіў час у месцы свайго, так бы мовіць, фармаваньня — у Полацку. Мая маці, калі прыехала на Полаччыну з Харкаву, дзе працавалі па разьмеркаваньні настаўнікамі яе бацькі, доўгі час не магла прывыкнуць да такой «субстанцыі», як новапабудаваны савецкі прамвузел, таму суседні стары горад быў своеасаблівай аддухай, куды яна езьдзіла адпачываць падчас цяжарнасьці.

...Такое адчуваньне, калі ўспамінаеш дзяцінства, што яшчэ не нарадзіўся канчаткова. Арган у Сафійцы, дзіўны пах у музэях, маміны сяброўкі, зь якімі мы раз-пораз шпацыравалі па былой вуліцы Леніна... Нібы адбывалася на іншай плянэце. Я ўсё яшчэ фармаваўся, нешта там мяне ляпіла, дамешваючы часьцінкі ці рэчывы з навакольля ў цеста. Дадавалася і на вёсцы пад Вушачамі, дзе я пражыў амаль паўдзяцінства са сваёй бабуляй, той самай, што працавала настаўніцай геаграфіі ў Харкаве. Пасярод ейнай красы — агароду, па якім яна вадзіла экскурсіі для аднавяскоўцаў. Увесну я заўсёды рыў там глыбачэзныя яміны. Без усялякага прызначэньня і матывацыі. Чым заўгодна:

рыдлёўкай, матыкай, старымі эмаляванымі міскамі... Тое ж адбывалася і ў яблыневых прысадах вакол нашай вясковай сядзібы.

Праз агарод ад хаты месьцілася былое хутарышча. Мясцовыя старажылы нават памяталі прозьвішчы ягоных жыхароў. Яно было абсаджанае старымі ліпамі, а праваруч... Праваруч ізноў-такі расьлі ліпы. Высачэзныя, з агромністымі дупламі, у якіх жылі крумкачы, што цягалі куранят у маёй бабулі. Тыя дрэвы ўтваралі авал вакол пустой пляцоўкі, на краі якой, амаль паміж дрэвамі, ляжаў вялізны гранітны валун. Месца гэтае мы так і звалі — Ліпы.

Я любіў там гуляць зь сястрой ці зь кімсьці зь вясковых сяброў, але куды часьцей даводзілася бавіць час у адзіноце сярод гэтых старых загадкавых дрэваў. Іншы раз, калі я прыяжджаў з гораду, часам мне было страшна аднаму заходзіць туды, я толькі скоса пазіраў з дварышча на тыя таямнічыя ліпы, пакуль не прызвычайваўся да наваколься, і тады зноў заходзіў «на госьці».

Мне заўсёды да дрыжыкаў хацелася ведаць таямніцы, якія хаваліся пад шатамі тых ліпаў. Але што значыць ведаць?.. Распытваць мясцовых дзядоў і бабуль? Не-е-е. Мне гэта не падыходзіла. У дзяцінстве для мяне ведаць — хутчэй адчуваць, датыкацца не кранаючы, каб пакінуць усё як ёсьць, ну так, менавіта адчуць гэта.

Пазьней тое дзіўнае, загадкавае адчуваньне дапамагло зразумець, чаму лепей не кра-

нацць некаторыя на першы погляд цікавыя месцы, напрыклад былыя капішчы, крыніцы, культавыя грудкі, тым болей старажытныя могільнікі. Байкі байкамі, але факты і вядомыя мне здарэньні сьведчаць, што адплата за такія пошукі ў выніку ох як не задавальняе тых, хто шукаў і знайшоў.

Усё ж мы зрабілі навакольны сьвет у нашым уяўленьні нейкім агрэсіўным. Вось у дзяцінстве была ў мяне прага ведаць з павагай. Але такое імкненьне — хутчэй выключэньне з правілаў. Паназірайце за дзецьмі, калі яны, напрыклад, бачаць павука, які на павуцінцы спускаецца на ложак. Яны яго баяцца і адхіляюцца, спрабуюць зьдзьмуць, скінуць. Калі пад тым жа ложкам нешта заўважаюць, то хутчэй узлазяць на яго, як бы ратуючыся. Ды і дарослыя мала чым адрозніваюцца ад дзяцей.

Згадваючы мінулае, не магу ня выказаць удзячнасьць маці — яна нарадзіла і спрыяла мне ў далейшым нараджэньні-сталеньні-фармаваньні, нібыта падсьвядома ведаючы пра маё працяглае нараджэньне. Маці я ўдзячны за сапраўднае выхаваньне, а не ўкладаньне розных установак для «нармальнага, як усе» парсюка пад каляднае сала.

...Як для мяне ўсё пачалося? Як я нарэшце канчаткова нарадзіўся? Я дакладна памятаю, што гэта быў ліпень 2003 года. Мне было 11 гадоў, я скончыў, здаецца, чацьвертую клясу... Пярэспа на правым беразе Палаты,

дробненькі такі рачны пясочак, сітца-друшлячок — і радасьць ад першых знойдзеных каваных цьвікоў ды скобаў. Першая знаходка — солід-барацінка польскай чаканкі, хоць я гэтага і ня ведаў, у прыгожай гладкай чорнай паціне. У мяне на руцэ ляжала маленькая мядзяная чорная манэтка, на ёй — арол, на грудзях якога нейкі крыж, хвосьцікі ў шасьцёрак на даце пакрытыя пацінай, таму мне падаецца, што манэта датаваная 1001 годам. Усё нутро сьціскае радасьць і азарт, які разганяе ў жылах кроў...

Азарт спалучаўся з прагай ведаць і знаходзіць. У полацкія музэі мяне праз пару месяцаў пачалі пускаць бясплатна, я быў там амаль як стацыянарны экспанат — гадзінамі мог стаяць ля вітрынаў ці проста пераходзіць ад адной да другой, наразаючы незьлічоную колькасьць колаў... Асабліва мне спадабаліся стэнды з манэтамі і рэчамі па крывіцкай тэматыцы, сярод якой вылучаліся зашпількі — фібулы. Жаданьне знайсці такую цацку гнала сядзець у сутоцы Палаты нават пад самай моцнай залевай ці заглядаць пад карэнішча кожнага хмыза на схілах Верхняга замка ў дваццаціградусны мароз. Дзіцячы азарт, энэргія і пафігізм рабілі сваю справу на выдатна.

У школе сапраўдным сьвятам былі ўрокі гісторыі, якія вёў выдатны настаўнік, як кажуць у такім выпадку — ад Бога, Мікалай Іванавіч Макрыцкі. На ўроках ён захапляў

вучняў сваім артыстызмам, жэстамі, якімі падмацоўваў кожны сказ у сваім расповедзе. Шанцавала і з падручнікам па гісторыі Беларусі. Невялічкая зялёная кніжачка, складзеная прафэсарам Загарульскім, і сяньня з удзячнасьцю ўсплывае ва ўспамінах.

Адзін з дзіўных на цяперашні час момантаў — з тае пары Полацак захаваў значную частку свайго, так бы мовіць, духу, пасьля шматлікіх рэстаўрацыйных акцый, узгодненых ці распрацаваных у «айнзацштабах» Менску і Віцебску.

Пачатак 2000-х запомніўся кустоўямі на Верхнім замку, за якімі, як здавалася, абавязкова знойдуцца муры нейкіх невядомых, не адшуканых раней навукоўцамі вежаў ці цэркваў; прырэчныя хмызы хавалі размывы ад вясновай паводкі, у якіх абавязкова знойдзецца ўсё тое, аб чым марыш: жмені фібул, талераў, пярсьцёнкаў... Стары патрэсканы асфальт, нефарбаваныя фасады дамоў, драўляная забудова, ад якой тады яшчэ нешта захавалася, невялічкая каштанавая алейка з помнікам Талстому каля «доміка Пятра», якая рамантычна выглядала дажджлівымі і ветранымі восеньскімі вечарамі, бо гойданьне лісьцяў цьмяна падсьвечвалася ліхтарамі; захад сонца з паўднёва-заходняга ўскрайку замчышча — фрагмэнты таго майго Полацку.

Калі мне трапляліся нейкія знаходкі, яны нагадвалі фотаздымачкі нечых лёсаў, дробныя кадрыкі мінулых жыцьцяў тых, хто быў

таксама часьцінкай абагульняючай «асобы» — Полацку. Я ніколі не заставаўся на тым месцы, дзе знаходзіў той «фотаздымачак», бо разам з захапленьнем, азартам мне хацелася адчуць у сабе іншыя часьцінкі старога Полацку, таму я йшоў шпацыраваць па вуліцах ці ўзьбярэжжы Дзьвіны, уяўляючы, як гэтая рэч, што ляжыць у кішэні — нейкая дробная манэтка, накладка, крыжык, шпацыравала ў далёкія стагодзьдзі разам з гаспадаром і як яна апынулася ў зямлі ці ў рэчышчы.

Зімой цягнула на берагі рэк жаданьне пабачыць, як нейкі падгулялы шляхціч, пакаўзнуўшыся на лёдзе, губляе з кашалю россыпам добрую жменю барацінак; як рыбак, прабіраючыся празь вербы каля грэблі, каб зьняць мярэжы, чапляецца дрэнна прышытым гузікам за галінку; як падчас наезду наўяў на Полацак удава падыходзіць да палонкі, каб адкупіцца ад прыхадняў зь цёмнага сьвету срэбраным пярсьцёнкам.

## ЕЗУІЦКІ КАЛЕГІЮМ

На Полацак тых маіх часоў прыпала яшчэ адна болей чым цікавая зьява — Езуіцкі калегіюм. Гэты напраўду адзін зь цікавейшых архітэктурных, археалягічных аб'ектаў стаў для мяне сапраўднай школай і выпрабаваньнем, хоць правёў я там ня болей за тры-чатыры гады, у той час, калі там вяліся рэстаўрацыйныя працы пасьля перадачы будынкаў Полацкаму дзяржуніверсітэту. У тыя гады там панавалі будаўнікі й археолягі.

Пра сам будынак... У адрозьненьне ад той часткі Полацку Езуіцкі калегіюм зьмяніўся да непазнавальнасьці. Ад старога выгляду захаваліся драбнюткія рэшткі, якія, так бы мовіць, надвор'я ня робяць. У той час, калі я першы раз апынуўся ў калегіюме, там ішоў рамонт. Менавіта рамонт, а не рэстаўрацыя, як гэта называюць сёньня. Будаўнікі выкарчоўвалі ўсё, што засталося ад ваеннага шпіталя, і пад іх працавітую руку трапляла ці ня самае каштоўнае. Падлога з драўляных дошак і пліткі пачатку XX стагодзьдзя, якая вытрымала выпрабаваньні ста гадоў і дзьвюх войнаў, разьбіралася, закладваліся нішы і дрэнажы (апошняе, між іншым, паўплывала на вільготнасьць у будынку). Неяк ужо бліжэй да заканчэньня рамонту мы зь мясцовым краязнаўцам Андрэем Бухавецкім запыталіся ў нейкай сустрэтай намі ў калідоры жанчы-

ны зь кіраўнікоў, ці ведае яна, што падлозе, якую яны нішчаць у гістарычным будынку, больш за сто гадоў? Адказ быў вычарпальны: «Ну і што?!» У засыпцы пад падлогай старанна корпаліся ўжо археолягі. Яны ж адбівалі пазьнейшыя савецкія ці кадэцкія закладкі з цэглы на нішах езуіцкіх часоў, ускрывалі і вывучалі хады ацяпленьня і дымавыя хады ў сьценах і пад той жа падлогай, дрэнажы ў сутарэньнях карпусоў... Іх знаходкамі звычайна былі рэшткі лістоў часоў езуітаў і піяраў, кадэцкія запалкі і фанэрныя скрыначкі ад іх, абгорткі ад тытуню, цыгарэтныя недапалкі, карыкатуры на настаўнікаў, намаляваныя на кавалках кардону, гузікі, аптэчныя бутэлечкі, кавалкі старых газэт ці часопісаў і таму падобнае цікавае сьмецьце тых часоў.

Калегіюм на сваім прыкладзе яскрава дэманстраваў пазьней асэнсаваную мной канчаткова гэтак званую тэорыю невычарпальнасьці, што стала адным зь першых дадзеных мне ўрокаў на жыцьцёвым шляху, і гэты ўрок быў там зусім не адзіным. Усе наступныя пасьля яго былі альбо замацаваньнем, альбо дадаткам да гэтага падмурку, таму ён і стаўся для мяне нейкай нават эпохай... Падобны да кубіка Рубіка зь некалькімі гранямі, пад кожнай зь якіх схавана яшчэ нейкая загадка, галаваломка, таксама зь некалькімі гранямі...

Калегіюм успамінаецца асабліва пры размовах з калегамі-капачамі, якія ўжываюць

фразы кшталту «ўсё перакапана», «месца N вынесена»... Пад кадэцкай дашчанай падлогай стогадовае даўніны археолягі выяўлялі хады ацяпленьня ўзростам паўтара стагодзьдзя. Пад імі ці побач мог знаходзіцца падмурак печы з разваламі рознакаляровых паліваных кавалкаў пячной кафлі (сапраўднага твору мастацтва полацкіх ганчароўкафляроў), узрост якіх пераваліў ужо за 250 гадоў. І, здавалася б, усё... Мы сыходзілі, лічачы, што тут мы канчаткова зрабілі сваю працу, «усё выбіта». Але калі прыходзілі тынкоўшчыкі ды маляры, высьвятлялася, што хады ацяпленьня ідуць яшчэ і па сценах, і там знаходзяцца ўсё тыя ж закладзеныя нішысхованкі. Заставаліся адно сьцены. Думаеце, усё? Дык вось акурат яны і былі аднымі з самых цікавых сховаў. Як культурны пласт у зямлі, яны, гэтыя тоны рознапамернай і рознафарматнай цэглы, несьлі ў сабе самае каштоўнае, тое, чым грэбуюць і лічаць непатрэбшчынай так шмат капальнікаў. Менавіта ў іх месьцілася інфармацыя аб перабудовах, якія рабілі ў свой час гаспадары будынка. Палосамі, арачнымі праёмамі, прамакутнікамі ці квадратамі закладак, умацаваньняў выступалі каміны, дымаходы, уваходныя праёмы дзьвярэй. І атрыманьне падобнай інфармацыі — як каштоўнасьць табой знойдзенай, здабытай і апрацаванай веды, нават толькі атрыманьне, без наступнага асэнсаваньня, несла сапраўднае, нязьведанае захапленьне,

якое патроху прыходзіла як дапаўненьне, а потым і замяняла сабою прыярытэт азарту ад знаходак. Знаходкі ў розных закладках гэтых ніш, вокнаў, праёмаў таксама распавядалі пра пікантныя асаблівасьці жыцьця будынка і яго насельнікаў. Пасьля асэнсаваньня знойдзенага прыходзіла ўсьведамленьне таго, што гэта адбылося ў нейкім памяшканьні памерам, напрыклад, усяго 3×4 мэтры і вышынёй 2,5—3 м, а зусім не на бяскрайнім полі ці ў кілямэтровым рэчышчы з мэтровымі па таўшчыні рачнымі адкладаньнямі.

Асабліва запомніўся выпадак, калі мы знайшлі дымаход у паўднёвай сьцяне залі, дзе раней, пры езуітах, месьцілася бібліятэка, а зараз, па іроніі лёсу, здаецца, сталовая ўнівера. Спадарства, зачытваю кароткую справаздачу!

«Пры разборцы закладкі мелкапамернай цэглай дымаходу ў Пд сьцяне, леваруч ад футарала былога гадзіньніка, у былой бібліятэцы Кадэцкага корпусу, былі знойдзены наступныя артэфакты:

1. Талерка парцалянавая, фабрыкі Кузьняцова, у фрагмэнтарным стане, 1 (адна) шт.;

2. Крыса, сушаная, з рэшткамі поўсьці, 1 (адна) шт.;

3. Кот, сушаны, муміфікаваны, з рэшткамі поўсьці, 1 (адна) шт.;

4. Сабака, муміфікаваны, бяз поўсьці, 1 (адна) шт.»

...Некаторыя з гэтых дымаходаў вялі на гарышча будынка, і яшчэ сёньня там знаходзяцца іх незачыненыя цагляныя вусьці. Падобнага кшталту знаходкі былі ня рэдкасьцю і ў дымаходах, і ў нішах, але менавіта пра тую застаецца толькі гадаць — ці гэта адно зь незьлічоных кадэцкіх свавольстваў, ці нейкая выпадковасьць.

Адзін, мабыць, з самых цікавых момантаў у калегіюме — сутарэньні. Агулам, канешне, гэта асобная гісторыя. Калі бачыш сучасныя фільмы жахаў, разумееш, як шмат страцілі іх стваральнікі! Скляпеністыя сутарэньні старога будынка, са старымі бойлерамі, лякарскімі вагамі, чыгуннымі ваннамі...

Напачатку, калі будаўнікі яшчэ толькі пачыналі свае працы, яны стаялі зусім некранутыя. За іх увогуле ўзяліся ў апошнюю чаргу, на фінальнай стадыі, так бы мовіць, калі пачалі ўсталёўваць сістэмы ацяпленьня і водаправоду.

Пакоі сутарэньняў я наведаў першымі з усяго калегіюму, калі толькі вывелі вайсковы шпіталь, і яшчэ стаяў бэтонны плот, ужо без калючага дроту, і яшчэ не было ніякіх будаўнікоў і археолягаў, а толькі адзін вартаўнік недзе ў пакойчыку на першым паверсе. Мы з выпадковым знаёмым, выбраўшы нейкі зімовы вечар, чакалі пад валам Івана Грознага моманту, калі на ходніках ня будзе мінакоў, хутка прабягалі праз вуліцу, перакульваліся,

як атрымаецца, праз плот, потым праз двор і хутка, але асьцярожна ныралі між рэшты ад жалезных кратаў у вакно пакоя пад двухпавярховай часткай корпусу...

Менавіта ў сутарэньнях я ўпершыню сутыкнуўся (у далейшым з самым частым, карысным і істотным з маіх «капацкіх» адчуваньняў) — са страхам. Як і радасьць, і захапленьне, і шмат таму падобных зьяваў, ён быў кожны раз новы, як з прычынаў яго зьяўленьня, так і з прычыны рознага яго ўспрыманьня. І кожны раз уражаньні ад яго ці барацьбы зь ім былі незабыўныя.

Напачатку і па нявопытнасьці я было думаў, што калі патлумачыць яго і звыкнуцца з гэтымі тлумачэньнямі, то ён пройдзе. Сёньня такое тлумачэньне, нават ад самога сябе, я палічыў бы незваротнай, вышэйшай ступеньню крэтынізму. Тлумачыў жа я яго звычайна непрагляднаю цемрай, гукаізаляцыяй і агульнай атмасфэрай закінутага аграмаднага старога будынка. Як у страху, так і ў спробах тлумачэньня я быў не адзіны. Полацкі археоляг Саша Салаўёў (між іншым, ён выдаў манаграфію па Езуіцкім калегіюме) быў адным з такіх людзей. Яго разважаньні зводзіліся да таго, што, мабыць, у часы апошняй вайны там некага дапытвалі і катавалі немцы... Пазьней я заўважыў, што пачуцьцё нават ня страху, а нейкага нутранога, ціхага, ледзянога жаху апаноўвае ня толькі ў сутарэньнях, а ўвогуле ва ўсім будынку. Нават у казематах

і калідорах, дзе сонца сьвяціла і грэла праз вокны бяз шыбаў, дзе шумелі і разгульвалі будаўнікі, гэтае пачуцьцё заставалася амаль нязьменным. Як першае, найбольш уражальнае для мяне сутыкненьне з навакольлем, што адбылося з дапамогай майго захапленьня, майго пачатку сапраўднага жыцьцёвага шляху, яно не пакінула мяне і сёньня. Праз 10—15 гадоў мне ўсё яшчэ трызьніцца, як я хаджу па тых памяшканьнях, заглядаю ў кожны пакой, але раптам разумею, што трэба сыходзіць, спрабую зьбегчы, пазбавіцца гэтага ледзянога подыху жаху. Нарэшце выходжу ў двор і бачу вакно сутарэньня, зь якога выходзяць трубы, абкладзеныя шкловалакном, і апраметную цемру гэтых вокнаў. Вакол сонца, побач стаяць сябры і будаўнікі, і я разумею, што гэтая цемра — улоньне гэтага жаху, і спрабую патлумачыць, што вось па гэтых трубах, вось-вось, з гэтай цемры — ці гэтая цемра... Так ці інакш, але нам трэба сыходзіць... Хутчэй, зараз!..

Людзі, нават з майго атачэньня, у сэньсе калегі, тлумачылі «езуіцкі страх» аднолькава са мной. Але цемра і гукаізаляцыя, стары будынак і яго памеры... Не, ня тое! Мне даводзілася аднаму бываць у глухім лесе і заходзіць у закінутыя ДОТы на былым УРы пад Полацкам. Бэтон мэтровай таўшчыні, поўная гукаізаляцыя і цемра, прытым імгненна, адразу як толькі заходзіш у адну з такіх «кропак», у дадатак кантраст зь лесам,

які літаральна віраваў ад жыцьця... У гэтых месцах дакладна змагаліся і гінулі людзі, але пачуцьцё ад наведваньня і побач не стаяла з адчуваньнямі ад калегіюму.

І вось, уявіце, здарыўся аднойчы ня дзе-небудзь, а ў тых самых сутарэньнях такі выпадак. Я зь мясцовым краязнаўцам Андрэем Бухавецкім неяк узьлез праз вакно пад двухпавярховую частку корпусу. Каземат, потым вузкі калідорчык, бойлерная кадэцкіх часоў — з ацалелымі з пачатку XX стагодзьдзя двума вялікімі бойлерамі. У канцы, у левай сьцяне, была ніша, але нехта да нас зрабіў у ёй прабоіну, невялікую, недзе 0,8×0,8 м, і высьветлілася, што гэта закладзены ўваход у яшчэ адзін пакойчык. Між іншым, у ім Андрэй і знайшоў свой знакаміты лаз, фота якога апублікавалі ўпершыню ў кнізе «Иезуиты в Полоцке». Дадам, што гэты лаз быў пасьпяхова зьнішчаны ў 2010 годзе, трапіўшы пад коўш экскаватара падчас чарговай «рэстаўрацыі». Пралезшы праз дзірку, мы апынуліся на земляной засыпцы, у якой шукалі адломкі пячной кафлі і іншыя артэфакты.

У той дзень усё пачалося як звычайна. Мы скінулі плецакі і пакеты ў кут, запалілі паходню і пачалі «шчыраваць». Таўшчыня падзялядьнай сьцяны была ня меней за мэтр, таму пасьля закладкі ўваходу цэглай у два шэрагі нішы атрымаліся з двух бакоў пакоя.

Сьвятло нашай паходні да той нішы з лазам амаль не дасягала.

...Спачатку я нават не зразумеў, што ўвогуле адбываецца, што пайшло ня так... Замагільны, нечалавечы стогн з той самай прабоіны, у якой нічога ня бачна. Жах спаралізаваў усе непатрэбныя варушэньні, і празь некалькі імгненьняў у галаве завіхурылі думкі: «Кінуць цаглінай ці жагнацца? А калі цагліна не дапаможа? Не дапаможа, дык буду жагнацца, што б ні было. Не дапаможа і гэта — Бог зь ім! Галоўнае — трэба дзейнічаць, рабіць штосьці!» Хто б ведаў, якое супакаеньне імгненна прынесла апошняя думка! Але я тут быў не адзін. Пра тое я неяк і забыўся... Спадар Бухавецкі, спужаўшыся, спатыкнуўся і заваліўся на сьпіну, але хутка ачомаўся. Расьсякаючы вільготнае паветра, буйнапамерная цагліна «хуткай дапамогі» XVIII стагодзьдзя ляцела ў цемру нішыўваходу. Пачулася лаянкавае мармытаньне. Неардынарны жарт Сашы Салаўёва даў свой плён, а сам ён надзіва пазьбегнуў траўмы ад адной з так любімых намі старажытнасьцяў... Мой першы практычны асэнсаваны і добра засвоены ўрок: у любых абставінах, у любой сытуацыі галоўнае — дзейнічаць. Як умееш. Як можаш. Усё астатняе прыйдзе. У тым ліку і заспакаеньне ад дзеяньня, яго асэнсаваньне і аналіз.

## КУДЫ ЦЯКУЦЬ РЭКІ?

Акрамя калегіюму мы бавілі час на рэках ці на іх берагах. Сэзон пачынаўся недзе ў красавіку, калі мы сядзелі на берагах падчас крыгаходу. Першыя сьцяблінкі траў на прагрэтым сонцам беразе, крыкі чаек, шоргат і сапраўдныя выбухі ад крыгаў віталі нас як старых знаёмых. А як радавалі першыя веснавыя знаходкі! Мядзяныя і білёнавыя манэткі, шкляныя рознакаляровыя пацеркі, таварныя плёмбачкі, гузікі... Іншы раз у чаканьні такой вясны, калі вільготная зямля на берагах яшчэ была схопленая маразамі, я зь сябрам хадзіў «шорхаць» па апалым лісьці на схілы берагоў Палаты пад так званай Чырвонай гарой. Перабіраючы гэтую лістоту, мы натраплялі на не такія ўжо і цікавыя, але ўсё ж першыя за сэзон знаходкі: дробныя савецкія даваенныя манэты, гузікі царскага мундзіра, запчасткі ад самавараў... А лета на самой Палаце, зь яе маўклівай прыгажосьцю пад засеньню схілаў і супакаяльным шоргатам лісьця на вялізных таполях!.. Восеньню, падчас сапраўдных бураў, таполі шумелі так, нібыта яны раззлаваныя. Дакладней, быццам закінуты дзядзінец вымаўляў праз іх свой гнеў. Да навакольных новабудоўляў прыватнага сэктару Запалоцьця, якія нарадзіліся, жылі дзякуючы ягоным заслугам — прыгажосьці і велічы яго будынкаў, аблогам, па-

жарам, абаронам і цяжкасьцям аднаўленьня, а ўзнагародай яму сталася закінутасьць, якую гэтыя дрэвы хоць неяк прыкрываюць... Жнівеньскі захад сонца на Дзьвіне, звон касьцёла і качкі: яны падплывалі ледзьве не да нашых ног, і мы падкормлівалі іх хлебам падчас назіраньня за павольным сыходам сонца за кроны дрэваў парку. А цішыня на запалоцкіх берагах падчас бабінага лета з павуціньнем на кустах лазы і зжаўцелай травы! З полацкіх пэйзажаў мяне заўсёды найбольш уражвалі закаты, асабліва ў сутоцы Палаты. Нават аўтамабільны мост не псаваў таго задавальненьня. І веснавая паводка ў лукавіне Палаты насупраць паўночна-заходняга выступу Верхняга замка. Уся нізіна ператваралася ў сапраўднае возера, што было даволі нязвыкла бачыць, ведаючы гэтыя мясьціны. Але й здаралася такая паводка ня кожную вясну.

Аднак нешта зьмянялася. Мне ўзгадалася кітайскае вучэньне фэн-шуй, зь якога апошнім часам так шмат сьмяюцца і зьдзекуюцца. Там ёсьць такое сьцьвярджэньне, нібыта людзі акрамя іншага падзяляюцца і па арыентацыі па частках сьвету. Прыкладам, існуюць людзі ўсходнія і людзі, што адчуваюць камфорт ад заходняга кірунку. Пра фэн-шуй я даведаўся значна пазьней. Пра захад я ведаў ці не заўсёды. Напрыклад, на ўсход ад мяне можа месьціцца нейкі парк, гай ці што падобнае, а на захадзе стаіць якісь

крыты бляхай ангар ці цагляны барак. Мне проста няма кайфу, калі я паварочваюся на ўсход, што б там ні было. Затое блакітнае неба над ангарам можа ўразіць як ніколі, калі яно на захадзе. Магчыма, і памыляюся, але па размовах з абсалютна рознымі людзьмі здаецца, што «заходнікаў» у нас куды болей. Неяк у адным з дакумэнтальных фільмаў расейскага аўтара Леаніда Млечына пра латыскіх легіянэраў у Другой сусьветнай распавядалася пра нейкага ідэоляга, ці прадстаўніка інтэлігенцыі, дакладна ня памятаю, прагерманскай арыентацыі, які тлумачыў выбар палітычнага і ваеннага хаўрусьніка прыблізна такімі словамі: «Нашы продкі прыйшлі на гэтыя землі з Паўднёвага Ўсходу. Усе нашы рэкі цякуць на Захад, сваёй накіраванасьцю паказваючы, куды і зь кім трэба рухацца Латвіі...» Прапаганда прапагандай, але нешта тут ёсьць падобнае да праўды і ў нашым становішчы. Цікава, што навукоўцы, якія вывучаюць міталёгію, надаючы столькі ўвагі паходжаньню і гісторыям, звязаным з рэкамі, чамусьці так няшмат уважаюць на іх напрамак.

Дык вось, тыя далягляды на захадзе пачалі патроху-паціху прыцягваць да сябе, выслабаняючы зь берагоў полацкіх рэк. Абшараў Полацку ўжо неяк не хапала. Пачало ўзгадвацца і тое, што ў Полацку я не мясцовы. Нарадзіўся ў Наваполацку, а паходжу... Усе мае сваякі былі адтуль, куды я так любіў

глядзець. Хоць, канешне, казаць пра гарадзкога жыхара, што ён аднекуль прыйшоў... Апошнія гадоў 800—900 яно толькі так і было, на тое ён і горад.

...Адчуваньне велічы ўсяго таго, што я зноўку бачыў. Пасьля такога патроху пачынаеш асэнсоўваць, як няшмат табе трэба. І што такое твае так званыя праблемы. Нават «сыходзячы» на адпачынак, як няшмат трэба для задавальненьня і аднаўленьня сіл. Кубачак гарбаты з цукеркай, якую можна смакаваць ледзьве не паўгадзіны, назіраючы за навакольлем. Якое задавальненьне прыносіла звычайная луста хлеба з алеем і шчопаццю солі ў выжывальных умовах сярод балот Паўночнага Ўсходу! Ці ведае пра гэтыя простыя радасьці хто-небудзь з сучасных «звычайных працоўных»?

Усё ўжо было інакш. Цяпер сапраўды бяскрайняй была забалочаная восеньская пойма Ўшачы, калі глядзець на яе, узьлезшы на разгалінаваньне сасны, што расла на ўзгорку. Галава кружылася ад таго, якія віражы закладваюць журавы ў гэтай бяскрайнасьці. Як яны не зьнікаюць, не распушчаюцца ў ёй, гэтак імкліва і адначасова мякка разразаючы яе, неабсяжную неагляднасьць? Разьлівы Дзьвіны ў Дзісьне і яе шум на парогах, выспы, асьвечаныя закатам у самой рэчцы Дзісьне, гмах касьцёла... Рэзала вочы вясновая зеляніна на крутых берагах дробных імклівых рэчак Дрысеншчыны. А вецер

на яе бяскрайніх палёх заўсёды быў нейкі асаблівы, не падобны як у іншых месцах.

З вышыні пражытага было добра бачна, што Полацак і напраўду быў толькі школай. Мае ўнівэрсітэты мелі куды болей шырокую праграму ва ўсіх сэнсах. Полацак падаваўся нейкім маленькім; яго абшары, колькасьць і плошча «перасоўваемай» зямлі, шчыльнасьць насельніцтва, якое зь вясны па восень адбухала пад кустамі, шпацыравала парачкамі на прыродзе, выгульвала сабак... Ага, вось! Амаль усе мае полацкія ўрокі былі тэорыяй, паказухай. Той жа выпадак у сутарэньнях калегіюму. Канчатковае рашэньне было ўсё ж прынята за мяне маім паплечнікам. Зь цягам часу такія магчымасьці сышлі на ніштo, на нуль. Практыка і абставіны, у якіх яе атрымліваў, іншы раз жорсткія нават сваёй пэрспэктываю, не дазвалялі нават спадзявацца на падобны вынік.

Што яшчэ? Вяртаючыся раз за разам у Полацак, я пабачыў чарговую яго якасьць: горад быў, так бы мовіць, памежны. Гэта складалася стагодзьдзямі. Падзелы Рэчы Паспалітай, разрываньне гораду паміж палякамі і саветамі ў 20-м годзе, нарэшце мяжа па Рыскай дамове, пасьля якой Полацак зрабіўся апошнім перадпамежным горадам; апошнім вузлом арганізаванай абароны стаў ён і для немцаў у 44-м.

250 гадоў для народа не такі ўжо і тэрмін, хоць падзеі і могуць зьмяняць як асобаў,

так і народы да непазнавальнасьці за меньшы час. Мне ўсё ж здаецца, што зьмены ў людзях паклалі менавіта падзелы. Далейшае панаваньне чужынцаў толькі дадавала нейкія рысы ці штрыхі, але камфортней асабіста я пачуваюся на паўднёвым беразе, які адышоў да рускіх у 1793 годзе. Здавалася б, столькі гадоў, столькі пакаленьняў, нават сучасныя жыхары прыгарадных вёсак — амаль цалкам дачнікі без тутэйшых каранёў, якія нічога ня ведаюць аб сваіх мясьцінах.

Памежнасьць Полацку адчувалася адразу па выезьдзе зь яго ў нейкі бок сьвету. Ну, акрамя Захаду ці Ўсходу, пра якія ўзгадвалася, трэба дадаць, што Дзьвіна напраўду зьяўляецца водападзелам ва ўсіх сэнсах слова. Адчуваньне інакшасьці жыцьця на абодвух берагах заўважалі ледзьве ня самыя «нечульлівыя» з маіх калегаў.

# ПЕРШАЕ ВЫПРАБАВАНЬНЕ

Адным зь першых напраўду самастойных выпрабаваньняў для мяне стаў выпадак у Варонецкім лесе. Старыя высачэзныя елкі нават у сонечны ліпеньскі дзень дрэнна прапускаюць сьвятло. Узвышшы, на якіх яны растуць, ускладняюць арыенціроўку: ці то рака, ці то балота ў лагчыне, а мо і дарога, па якой трэба выходзіць?.. Аднак я не заблукаў, проста затрымаўся на адным цікавым і аж занадта прыгожым месцы. Быў канец сакавіка, і а палове дзявятай вечара было ўжо зусім цёмна. Дарога, па якой я рухаўся, была зьледзянелая, з глыбокімі лужынамі, і падэшвы гумовых ботаў сьлізгалі па ёй ледзьве не як канькі, таму пераступаць даводзілася меленечкімі сьцярожкімі крочкамі.

Цемра, гукі ў вечаровым і без таго змрочным лесе стваралі адпаведныя адчуваньні. Працяг уроку, што я атрымаў у езуіцкіх сутарэньнях, даваў зразумець, што такое асэнсаваньне дзеяньня. Ісьці назад, каб пераначаваць марозную ноч, ужо немагчыма: цемра хоць вока выкалі, па такой нават навобмацак цяжка знайсьці хоць якую дравіну для вогнішча ў сырым веснавым лесе, у даважак, акрамя поля, па якім я хадзіў, і дарогі, на якой я стаю, мне невядомыя ніякія тутэйшыя мясьціны. Дый ці ёсьць розьніца — вяртацца і сядзець ці йсці па гэтай цемры

і холадзе? Усё ж адзінае разумнае выйсьце — ісьці наперад. Хоць ад страху і цяжка перастаўляць ногі, робіш гэта больш галавой, нейкім нутраным рухавіком, чым самімі нагамі. Як яскрава б'е падобны выпадак па такой якасьці, як нерашучасьць, і паказвае яе ўбоства і здрадлівасьць! Наперад — тры кілямэтры па зьледзянелай дарозе, адзін па вёсцы і дваццаць да Полацку.

...Адаспаўшыся ў горадзе, прачнуўшыся ў ложку і пасьля ранішніх спраў выйшаўшы ў горад, я адчуў нешта яшчэ: дробнасьць гэтай гарадзкой мітусьні, надуманасьць бытавых праблем, такіх, напрыклад, як хамства і бюракратызм у розных установах, імкненьне пазыцыянаваць сябе важным перад навакольнымі... Гэта быў толькі першы штуршок да ўсяго, што зразумеецца пасьля. Ланцуговай рэакцыяй пачалі выяўляцца рэчы, якія, як я зразумеў, можна высьветліць толькі з дапамогай самастойнага «абнаўленьня» сваёй скуры.

Пазьней некалькі разоў атрымлівалася знаходзіць волю ці спантанна адразаць шлях да адыходу, каб наўмысна паставіць сябе ў больш складанае становішча: блукаў ужо не па дарогах, а па сапраўдных лясных гушчарах. Тое нагадвала сапраўдную шокавую тэрапію, асабліва рэзкая зьмена моцных эмоцый, такіх як ледзяная паніка, эйфарыя, імкненьне да спакою і сузіраньня. Пасьля выхаду атрымліваеш асэнсаваньне адной

асабліва важнай рэчы, безь якой далейшы шлях разьвіцьця і скураскіданьня немагчымы — хто і што ты ёсьць. Тут, у адзіноце, пасьля напружаньня, зразумела, хочацца выгаварыцца. Яркія фарбы пераэжытага, разбуджаная ўнутраная балбатлівасьць, якія, здымаючы стрэсы, дапамагаюць замацаваць адоленае. Калі яны зьнікаюць, акунутыя ў рошчыну будзёншчыны, дык робяцца халодным загартаваным інструмэнтам, адкладзеным да патрэбы некуды далёка на паліцу.

Аднак «полацкія» пошукі і блуканьні па вёсках былі не адзіныя. Яшчэ з тых, «полацкіх» часоў даводзілася «пахварэць на вайну».

## «ПАЧУЦЬЦЁ ВАЙНЫ»

Першыя выезды «на коп» па вайне адбываліся наступным чынам: на выходных ці на маіх вакацыях за мной заяжджалі «камрады», гадзін у 6 раніцы. «Малы», ці «пасажыр», ехаў у якасьці «талісмана»: «хай вучыцца», «прышпільны хлопец»... Першыя мае выезды адбываліся, калі я вучыўся, здаецца, у клясе 5-6-й. Свае дзіцячыя пошукі ў роднай вёсцы, мара знайсьці цэлы нямецкі набой, чытаньне кніг кшталту «Ніколі не забудзем»...

Галоўнае ў гэтых першых паездках — адчуваньні. Везьлі нас звычайна тыя, зь кім дамовіцца нехта з калег, часьцяком такія ж маладыя хлопцы, гадоў па 20—25, ня болей, на старых «шасьцёрках», «аўдзюхах» ці дапатопных «Вольвах». У машыне заўсёды грала радыё альбо нейкая папса на касэце, але яна не магла зьмяніць ці неяк паўплываць на настрой.

Адчуваньні ад вайны — вясковых і лясных пэйзажаў паабапал дарогі, лясоў, пералескаў, гаёў з адзіночнымі ячэйкамі, акопамі, траншэямі, што віліся пад елкамі і сярод кустоўя, бліндажамі на выспах, стваралі пачуцьцё, якое, як і шматлікія іншыя, амаль немагчыма перадаць словамі. Вельмі груба кажучы, то была мешаніна з нейкай жалобы, суму, унутранага бязмоўя... Ад гэтага

засільля было вельмі цяжка на душы, якая прагна прасіла вяртаньня да гоману цывілізацыі і штодзённых, звычайных і звыклых турботаў. Але галоўная пакута ў тым, што, як толькі гэтыя жаданьні збываліся, зь нейкай мазахісцкай прагай яшчэ болей цягнула ізноў вярнуцца да пакінутага сярод лесу і напаўзакінутых вёсак... Вядома, адчуваньні залежалі і ад месца ці прыроды. Найболей прыгняталі хмызы, лісцьвянікі з алешыны і асіны на ўсходзе, і неверагодныя адчуваньні пакідаў веснавы сасновы бор на паўночным захадзе. Напачатку чэрвеня ў такім бары проста пераймала дыханьне ад паху хвоі, сонца, і пах раскапанага пяску абязводжваў так, што замест сьліны заставалася адно цягучая пена, а разам усё гэта стварала водар, ад якога кружылася галава. Восеньню, у месцах, парослых кустоўем ляшчыны, адзінкавымі соснамі ў абхват, я хадзіў, забыўшыся пра пошук ад бачаньня гэтай прыгажосьці. У такія моманты на трафеі шанцавала болей за ўсё, бо менавіта павага, захапленьне, цікавасьць, а не надакучлівасьць і зануднае калупаньне эфіру болей за ўсё пасуюць як у гутарцы з людзьмі, з жывымі і з мёртвымі, так і з наваколлем. Не магу не дадаць, што туманы ў такім лесе стваралі невымоўнае пачуцьцё цікавасьці і загадкавасьці, ад якога ажно пачынаўся нейкі прыемны сьверб.

Зь цягам часу, калі я ўжо езьдзіў адзін, «пачуцьцё вайны» нікуды не зьнікла, ня

стала слабейшым, а... найбольш удала будзе сказаць, што мы зь ім пасябравалі і яно перастала быць такім пакутлівым, як спачатку. І яшчэ. Калі я ехаў па тых жа дарогах, але ўжо проста ў вёску, на госьці, некуды па справах, я не адчуваў (нават успамінаючы) усяго таго, што было пры паездках на «капаніну». Напраўду, намер — вялікая справа...

Ужо калі падрос, узьбіўся на адпаведнае абсталяваньне, я патроху пачаў сам ладзіць «экспэдыцыі». Прыроджаная негутарлівасьць, імкненьне да адзіноты вымушалі працаваць ня болей чым з двума паплечнікамі, але і гэта мінула. Асноўным маім ворагам, калі я знаходзіўся адзін у лесе, напачатку быў мой стары знаёмы — страх. Проста нейкі жывёльны, ён зачапляўся горш за любыя кайданы, іншы раз да такой ступені, што літаральна скоўваў ногі, не даючы зрабіць і кроку, высунуцца зь ямы, зазірнуць за лапы ялін, якія гойдаліся. Прычыны для яго былі розныя, часьцей за ўсё надуманыя і па дарозе да месца добра разьдзьмутыя: натрапіць на засаду з ворганаў, ці яшчэ каго з падобных, страх заблукаць, што не даваў магчымасьці адысьці ад шашы болей чым на паўкіляметра, перад дзікімі зьвярамі ці зграямі зьдзічэлых сабак, якія зьбягаліся з навакольных лецішчаў. Ад апошніх доўгі час не ратаваў ні пярцовы аэразоль у кішэні, ні сякера за поясам, ні гострая рыдлёўка з даўгім тронкам. «Шухер» здараўся ад раптоўнага

крыку зязюлі, трэску галінкі, шолаху лісьця ці падзеньня з яловага гальля веснавога сьнегу. Галоўнай прычынай зьнікненьня, прытупленьня «ляснога» страху, а дакладней фінальнага высілку ў барацьбе з ім, стаўся вельмі просты фактар — задзяўбала! Былі, канешне, і іншыя — вопыт і стан здароўя, якія на трэцім дзясятку гадоў ужо даваўся ў знакі і вучыў, што няма нічога вечнага пад сонцам; і разуменьне, што калі і паміраць, дык за любімай справай усё лепей, чымся ў ложку; прызвычаеньне да абставінаў, азарт ад знаходак ці засяроджанасьць на пошуку... Адзіны страх, якога я надзіва ня меў пры выхадах «на вайну», — падарвацца на боепрыпасах, і растлумачыць гэта, як і шмат чаго іншага, нават сабе, я па сёньня не магу і не спрабую.

# АДЧУВАНЬНЕ ПРЫСУТНАСЬЦІ

Вярнуся да выездаў «на старыну», «на поле», як яшчэ гэта называлася. Мне асабіста запомнілася з тых часоў адчуваньне жыцьця ў ліпавых прысадах паабапал дарог, дубах каля хутарышчаў. Бывае, стаіш так, адпачываеш і, гледзячы на месца, не разумееш, чаму такі ўпэўнены ў тым, што на гэтым месцы нешта стаяла? Ажно дрыжыкі прабіраюць — адчуваньне жыцьця ў гэтых нічым непрыметных дрэвах, зеляніне поля, зьліцьця яго з блакітам на даляглядзе... Я зьвярнуся да тлумачэньня гэтага пытаньня ніжэй.

Калі ж нарэшце пачынаў працаваць на гэтым месцы, то іншы раз узьнікала яшчэ адно на той час новае адчуваньне — прысутнасьць. Яно часьцей за ўсё не было напружлівым ці палохаючым, проста было і ўсё. Першы раз я адчуў такое на Палаце, калі стаяў пасярод рэчкі. Хуткая плынь, яе булькатаньне стваралі ўражаньне, нібыта нехта шэптам размаўляе за тваёй сьпінай. Яно ўзрастае асабліва, калі спрабуеш не зьвяртаць на яго ўвагі, адхінуцца ад яго справай, працэсам, усё мацней, мацней... Спыняецца толькі тады, калі нарэшце павернешся, пастаіш і паназіраеш за плыньню.

Іншы раз тая прысутнасьць магла выклікаць і непрыемныя пачуцьці. Але мне болей запомніўся выпадак на месцы былой вёскі

пад Полацкам. Зьнікла яна, падобна, недзе ў саўдэпаўскія часы. Ну як сказаць, зьнікла... Па краі берагу ракі, на якім яна стаяла, захаваліся дубы і так добра вядомыя мне шчыльныя прысады слівавага кустоўя, а за імі знаходзіліся цагляныя падмуркі і сутарэньні з бутавага каменьня. Захавалася яма ад перасохлай сажалкі, абсаджаная вербамі, а вакол саміх падмуркаў стаялі розныя мэталёвыя дзежкі і каністры, падрыхтаваная некім да вынасу і складзеная цэгла ад печышчаў. Агулам здавалася, нібыта вёску часова разабралі і вынесьлі некуды «на зімоўку», яна хутка вернецца сюды, мо праз тыдзень, ня болей — ад драўляных сьценаў хат і бляшаных дахаў да вады ў сажалцы... Там акрамя пачуцьця абжытасьці месца я адчуў і прысутнасьць некага з жыхароў: нібыта раптам з-за тых слівавых кустоў выйдзе такі тыповы селянін са шчэцьцю і вусамі, апрануты ў дублены кажушок і кашулю ў краткі, у пацёртай чорнай кепцы з караценькім брылькам, самакруткай у роце, запытаецца: «А што ты тут шукаеш, хлопец?» Там усё неяк склалася разам: абжытасьць, прысутнасьць. А якія там былі краявіды! Нават мяне, спакушанага на падобнае, неяк аж занадта перабрала, духі пераняло, калі я выйшаў на стромкі бераг той ракі.

Непрыемным жа гэтае пачуцьцё было, калі заходзіў у нейкі закінуты дом. Падчас пазьнейшых падарожжаў з начоўкамі, вы-

хадаў на некалькі сутак, нават калі ў мяне быў выбар — начаваць пад адкрытым небам ці ў нейкай закінутай хаціне, я заўсёды выбіраў начлег на прыродзе. Холад, начныя гукі, канешне, ня дужа каб... але яны неяк не выціскалі са свайго навакольля. З хатамі было інакш. Ня тое каб страх, а нейкая зацятасьць у гэтай цішыні, цемры няспынна напружвала, назірала нябачнымі вачыма за кожным рухам. Я зноў узгадаю калегіюм зь яго адчуваньнем жаху: колькі людзей там пакінула свае цені? Чарговае разуменьне: нярэдка бывае — чалавек чалавеку воўк. Тым ня меней, нягледзячы на таямнічасьць і закрытасьць, мы даволі часта сустракаліся і размаўлялі з рознымі людзьмі, адказвалі на стандартныя, надакучлівыя пытаньні, на вёсцы часам зьяўлялася і неабходнасьць самім аб нечым пытацца ў мясцовых.

Весьці размовы лепей за ўсё з жанчынамі: мужыкоў часьцяком заносіла. Матывацыяй была багатая фантазія, камусьці трэба зьняць грошы на шклянку, камусьці проста паразмаўляць... Калі ж гутарыш зь якой старой бабуляй на вёсцы, іншы раз захапляешся гэтымі людзьмі — як праяўляецца ў іх нейкае высакародства, што адлюстроўвае іх жыцьцёвую, уцягнутую з навакольля мудрасьць. Ня ў вопратцы ці знешнасьці, а як у людзей «вышэйшага сьвету»: кожнае слова, міміка, погляд — невыкаранялььна закладзена ў іх. Калі яны распавядаюць, так вось седзячы на

лаве, нешта ўспамінаючы, зьвесіўшы счэпленыя рукі, заплюшчыўшы вочы і адхіліўшыся, каб абаперціся на сьцяну дома за сьпінай, нібы ў нейкім траньсе. Яны нібыта не ўспамінаюць, а чытаюць запісаныя ў навакольлі нябачныя нетутэйшаму воку байкі пра карэты Напалеона, магілы шведаў, чортавыя і змяёвыя камяні і схаваныя пад імі скарбы... Мабыць, яны бачаць яшчэ нешта ў тых запісах, калі адгаворваюць хадзіць туды, шукаць тыя скарбы, знаходзіцца пасьля заходу сонца каля тых камянёў. Мякка так адгаворваюць, але гэтая мяккая, нібыта няўпэўненая моц у словах — спаралізоўвае.

Асаблівае задавальненьне атрымліваеш, калі проста чуеш ад каго заўгодна мясцовыя байкі і паданьні, пра якія чытаў недзе ў навуковай ці краязнаўчай літаратуры. Чуеш, як курганы называюць францускімі магіламі, як нейкі пан жыў на гарадзішчы жалезнага веку, альбо як мне даводзілі ў Полацку, што знакаміты па царскіх паштоўках млын на Палаце пад Спаскім — нямецкая электрастанцыя, якую будавалі палонныя. Тое самае задавальненьне, калі глядзіш нейкую кулінарную праграму па тэлевізіі, а потым сам спрабуеш прыгатаваць пабачаную страву.

## «ДУРКУВАТЫЯ ПРЫЕХАЛІ»

Падзея, якая згадваецца найчасьцей, зразумела, апошняя вайна. Калі пытаешся ў мясцовых, дзе тут што было, першае, што ўспамінаюць, — партызаны, немцы ці нашы адступалі... Тое ня дзіўна — апошняя катастрофа такога маштабу яшчэ доўга будзе захінаць ціхае мірнае жыцьцё і рамантычныя легенды аб навакольным сьвеце.

Мне запомнілася бабуля майго напарніка, якая агулам добра нас прыймала ў сваёй хаце пад Віцебскам, калі мы выбіраліся туды «па вайне». Але да нашых пошукаў яна ставілася ня вельмі — згадваецца яе постаць, калі яна сустракала нас на парозе хаты: згорбленая, далонь «брыльком»... «Дуркуватыя прыехалі! Семдзясят гадоў прайшло, а яны ўсё ішчуць! Мы там пасьля вайны жылі, ср...і там, а яны там рыюць! Нашто вам тая ржа? Вось пойдзеце ў армію, дадуць вам аўтаматы, каскі, намучаецеся яшчэ. Дуркуватыя!» Але калі яна нешта і распавядала з тых часоў (падчас заканчэньня вайны ёй было недзе 11 гадоў), то ў сапраўднасьці яе апавяданьняў можна было не сумнявацца. Пра баі, пра жаўнераў розных армій і нацыянальнасьцяў, якія адпачывалі ў іх вёсцы, пра мясцовага «разумнага», што да вайны руйнаваў цэрквы, а пасьля павесіўся без дай прычыны.

Аднойчы, калі мы раскопвалі чарговую зямлянку на беразе ручая за вёскай, яна нечакана падышла да нас.

«Во ў гэтай зямлянцы мы жылі, во ў гэтай была баня. А там жыў туберкулёзьнік, ён усё ў банкі кансервныя пляваў... Вы не капайце там». Баню мы знайшлі, але яна крыху ссунулася — апынулася праваруч той зямлянкі, дзе мы рылі. Яна была запоўненая тубамі ад нямецкай зубной пасты, вялізнымі чыгунамі, тронкамі ад станкоў для галеньня... Асабліва мяне ўразіў аповед пра бамбаваньні падчас праслаўляемага «Баграціёну». Савецкія бамбардзіроўшчыкі, якія панавалі ў небе, наносілі ўдары па навакольлі, пад іх трапляла ўсё, што рухалася па зямлі. Па яе аповедах, цяжкапараненыя вайскоўцы абодвух бакоў, ведаючы, што за імі ніхто не прыйдзе, закопвалі сябе ў невялікіх, самастойна вырытых сапёрнымі рыдлёвачкамі выемках, але ж, вядома, не маглі закапаць галаву, якая працягвала тырчэць зь зямлі. Калі нарэшце самі жыхары навакольных вёсак, што хаваліся ў ваколіцах, праходзілі паўз палі, то заўсёды бачылі гэтыя вытырклыя пасярод бомбавага ворыва галовы.

Калі ж мы размаўлялі зь мясцовымі, то адно з самых частых пытаньняў ад іх: «Адкуль вы ведаеце, дзе шукаць?» Для такіх людзей вычарпальнымі зьяўляюцца адказы «па мапах», «з кніг ведаю», «старыя падказалі» (хоць апошняе небясьпечна шматчасо-

вай павучальнай размовай ад «гіперпадкаванага» суразмоўцы)...

Ня варта адказваць і «проста ведаю». Іншы раз такія адказы трактуюцца пабочным чалавекам як «ну і нюх у цябе», «містыка нейкая», і што найбольш дастае, дык гэта гадзінныя пакутлівыя спробы растлумачыць такія зьявы. Чаму так?

Па-першае, пра «нюх». Гэта не зусім слушнае азначэньне, хутчэй гэта такое імкненьне ці звычка, як у варон, цягнуць усё, што блішчыць. Кавалкі шкла пад нагамі, камяні незвычайнай формы, круглякі зялёнага колеру... Месцы ж для пошуку распазнаюцца часьцей за ўсё спантанна, бо такі ж рэльеф быў, прыкладам, на вёсцы, што знойдзена па тых жа мапах. І такія рэчы адкладваюцца на ўзроўні падсьвядомасьці. Першы прыклад, дарэчы, вельмі добра дэманструе, што нешта тое, што мы апантана шукаем, часьцяком ляжыць пад носам, і справа толькі ў нас саміх.

Па-другое, пра «містыку». Адзін мой знаёмы захапляецца калекцыянаваньнем манэт Расейскай Імпэрыі. Ён распавёў пра выпадак, калі ехаў на чарговы «коп» і спыніўся. Поле, паўзь якое ён праяжджаў, па невядомай яму прычыне выклікала ў яго цікавасьць, хоць на ворыве не было звычайных для такога месца кавалкаў керамікі, побач не было ніякіх вадаёмаў, дый рэльеф не вылучаўся нейкімі асаблівасьцямі. Перасіліўшы сябе, ён усё ж

сабраў мэталашукальнік і выйшаў «прагулянца». На дзіва, яго знаходкамі сталі шэсьць буйных срэбраных манэт Расеі, прытым даволі рэдкіх.

І няма тут ніякай містыкі ці чагосьці паза межамі разуменьня! «Містыка» — гэта проста прабіваньне ўсё той жа нашай задубелай «як мае быць» таўстаскурасьці, адсутнасьці альтэрнатывы ва ўспрыманьні. Усё на сьвеце пакідае сьляды, і ня варта думаць, нібыта яны складаюцца толькі з кавалкаў керамікі і плямаў чарназёму на ворыве. Спрацоўвае і закон: зь кім пабярэшся, ад таго і набярэшся. Уплываюць людзі, чыім заняткам робіцца мінулае, зь яго рэчамі, сталым пошукам інфармацыі аб тых часах. Асяродак, той самы, што атачаў продкаў, — прырода. Я не магу, аднак, адказаць нават за сябе, што было б, калі б прабіцьцё «скуры» здарылася са мной раптоўна; чарговы раз дзякую за гэта маім страхам, эмоцыям і перажываньням. Падобныя зьявы адбываюцца ў творчых людзей, толькі называюць іх больш звыклым словазлучэньнем — «творчы ўздым». Ня трэба думаць, што такія рэчы — лёс толькі творчых ці роднасных ім асобаў. Ну, прыкладам, як на вялізнай адлегласьці бацькі адчуваюць, што нешта здарылася зь іх дзецьмі? Ці тыя ж блізьняты? Ці, напрыклад, нашыя продкі-земляробы, большасьць якіх, зразумела, не пра творчасьць думалі і ня ёю жылі. Нездарма яны пакланяліся хлеўнікам,

дамавікам, русалкам, зьмеям... Мы звыкліся глядзець толькі на словы — «русалка», «дамавік»... Уяўляць проста міталягічныя вобразы, таўстаскура абараніўшыся як ад іх сутнасьці, так і ад сутнасьці навакольнага сьвету. Менавіта таму нашым менш разьвітым, у параўнаньні з продкамі, сучасьнікам і патрэбна, каб выказаць нейкую больш-менш разумную думку, кулямётнымі чэргамі, па сотні слоў у хвіліну трэсьці паветра і пры гэтым так нічога і не сказаць.

Наш розум, нашыя пачуцьці ня могуць нармальна існаваць без асялка ў выглядзе вельмі спэцыфічных, па разуменьні абывацеля, перажываньняў, што адчуваюць паляўнічыя, капальнікі, падарожнікі... Яны ня толькі глядзяць на іх, але і параўноўваюць... Шмат хто з гэтых людзей зь цягам часу вяртаецца ў цывілізацыю, толькі каб параўноўваць. Як такое магчыма? Мусім прызнаць, што для гэтых людзей іх справа — гэта і ёсьць іх жыцьцёвы шлях. Усё астатняе — тло. Таксама патрэбнае, таксама неабходнае, але ўсё тое на другім пляне, побач са шляхам. Моц такой асобы ў тым, што дэ-факта яна без эмоцый, нікому непатрэбных разважаньняў і апраўданьняў прызнае свае прыярытэты, адсоўваючы на тло сям'ю, працу, нейкія задавальненьні... Робіць свой галоўны выбар. Агулам падсумоўваючы, такі чалавек робіць гэта вольна ад вонкавых меркавань-

няў і ўстановак, паводле сваёй сапраўднай зацікаўленасьці да навакольля, да жыцьця.

Фактычна атрымліваецца станаўленьне на жыцьцёвы шлях. Апошнім часам я ігнарую пытаньне «капацца ў брудзе — твой жыцьцёвы шлях?», бо гэта ўжо ня толькі погляд з-пад згаданай тоўстай скуры. Клініка, карацей. Што на галоўную справу жыцьця, што на тло чалавек глядзіць праз нейкую, скажам, прызму: сямейны — праз сям'ю, бізнэсмэн будзе вырашаць жыцьцёвыя пытаньні па прыкладзе сваіх спраў... Адзін з «сэнсаў рыдлёўкі» — глядзець на навакольле і людзей — пастухоў, турыстаў, грыбнікоў, вяскоўцаў, гарадзкіх жыхароў — і размаўляць зь імі падчас шпацыраў з мэталюшнікам. Не сказаць, каб такая форма назіраньняў самая частая ў жыцьці, але ж яна на пярэднім пляне. Цікава глядзець і на рэакцыю сустрэтых: у лесе звычайна людзі палохаюцца, зьбягаюць. Быў сьмешны выпадак, калі я аднойчы вылез у сваім тыповым лясным прыкідзе з вырытага акопа і ўбачыў удалечыні нейкага хлопца, што мільгаў паміж соснаў. Ён згубіўся, калі шукаў сваю кампанію, якая балявала недзе на другой высьпе за балотам, як я зразумеў па яго блытаным, спалоханым тлумачэньні. Я ўсё спрабаваў дапамагчы яму адшукаць сяброў, а ён усё намагаўся даць лататы, хоць я й імкнуўся, як мог, супакоіць яго, маўляў, што не бандыт... Нарэшце мы дайшлі да гаці, і, паказаўшы на

яе, ужо збіраўся распавесьці, як яму прасьцей трапіць да сваіх, толькі дзе там — не чакаючы маіх тлумачэньняў, хлопец «даў па пятках»... Нарэшце ўва мне ўсплыло пачуцьцё ўдзячнасьці да нашай афіцыйнай прапаганды, што малюе нас як крымінальнікаў, забясьпечваючы нам спакой хаця б у лесе! Пазьней, у тым жа лесе, неяк двое грыбнікоў-пэнсіянэраў, муж і жонка, падышлі да ўжо вырытага мной акопа, на доле якога я калупаўся амаль у ляжачай позе. Яны зь цікавасьцю паглядзелі на мяне, і раптам жанчына выдала перл: «Хлопчык, чаго ты тут рыеш? Рыць трэба каля возера, там зямля вільготная, а тут пясок сухі зусім, чарвей няма! Ды і глыбока так!» Кожны бачыць тое, што яму ўяўляецца.

## ВЯСКОВЫЯ І ГАРАДЗКІЯ

Менавіта «на копе» я пабачыў і адчуў розьніцу паміж вясковымі і гарадзкімі жыхарамі. Першае, што кідаецца у вочы, — розьніца паміж розумам і мудрасьцю, якой валодаюць вяскоўцы. Пра гэта, канешне, можна разважаць і апавядаць гадзінамі, але з уласнага вопыту скажу, што ў мяне ніколі не было канфліктаў зь вяскоўцамі падчас працы. Калі гарадзкі жыхар больш падкаваны ідэалягічна, ён менш заняты чымсьці ў адрозьненьне ад селяніна, то зь вясковымі ўсё інакш, тым ня менш, і з пралетарамі на нажах на маёй памяці я размаўляў разы два, ня болей. Хоць сяляне і глядзяць тыя ж перадачы па дзяржаўным тэлебачаньні (да слова, на вёсцы амаль адзіная і безальтэрнатыўная інфакрыніца), гэта ўсё не ўспрымаецца імі, бо па сутнасьці супярэчыць нормам іх жыцьця. Крывадушнасьць, жорсткасьць, нахабная хлусьня — усё гэта проста не прыжываецца.

На вёсцы да маіх таптаньняў па полі таксама не заўсёды ставіліся прыхільна, але ў такіх выпадках людзі падыходзілі, каб на свае вочы пабачыць і разабрацца, што гэта за такі «чорны капальнік». Пастухі, трактарысты, простыя сяляне... Што на вёсцы, што ў горадзе незадаволеныя часьцей за ўсё проста абыходзілі нас, зрэдку касавурачыся ці нешта мармычучы.

Аднак найбольш яскравым для мяне стаў выпадак на Полаччыне. Я даўно «з апетытам» паглядаў на адзін агарод, зямля на якім была нашпігаваная керамікай, і аднойчы сарваўся: плюнуў на ўсё, сабраў мэталюшнік і засяродзіўся на справе. На даляглядзе, вышэй за тое ворыва, стаяў дом, летнія крэслы і тапчаны пад ім, там нехта адпачываў, і, зразумела, мяне замялі:

— Саня, на тваім агародзе золата шукаюць!

— А х... зь ім, хай шукаюць!

Падобна, адной з прычын незацікаўленасьці да ўсякіх там афіцыйных дэкрэтаў-загадаў зьяўляецца наш мэнталітэт. Агулам беларусы — даволі адасобленыя, такія самі ў сабе людзі. Не падобныя да немцаў, зь іх парадкам у стройных калёнах, да рускіх, здольных зьбіцца ў бязьлікую арду, ці палякаў, здатных «выйсьці шчыльнымі радамі» за свае ідэалы... Менавіта таму мы заўсёды сяліліся хутарамі, нават вёскі складаліся з хутароў. Мне здаецца, тут і хаваецца адказ для гісторыкаў, чым жа быў партызанскі беларускі рух: калі ў лесе былі тыя ж «краёўцы», яны засядалі ў ельніку. Калі ў лесе засядалі беларусы, то кожны пад сваёй елкай. Мая бабуля, родам з ушацкай вёскі Пад'язеньне, калі чытала «Народную волю», заўсёды касавурылася пры згадках біяграфіі Васіля Быкава, а дакладней таго, што ён нібыта нарадзіўся ў вёсцы Бычкі. «Ён жа нарадзіўся на хутары,

ну хто гэта піша, што ён зь вёскі!..» Маюць рацыю тут напраўду ўсе. Беларуская вёска, сапраўдная, не кранутая рознымі рэформамі і калектывізацыямі, больш падобная да супольнасьці хутароў, інакш кажучы, тут разам сабраліся ўсё адасобленікі. У навуковай літаратуры існуе азначэньне «вёскі з кучавой пляніроўкай», а пачатак канца, так бы мовіць, для іх паклала знакамітая ў навуковай гістарычнай літаратуры аграрная рэформа — Валочная памера. Але тое ўжо так, да слова.

Дык вось, ізноў да капальніцтва. На маёй вёсцы азначэньне «чорны капацель» да мяне падобных не ўжывалі ніколі. «Хлопцы капейкі (золата) шукаюць»... «А хто такія «чорныя капацелі»?» — «Ну, гэта тыя, хто снарады ішчуць, ну аружые там усякае», «Хто магілы рые, золата з зубоў здымае»... Неяк ехаў са сваяком праз вёску Кульнева на Расоншчыне, праяжджаем паварот на замчышча Сокал на рацэ Дрысе.

— Во тут яны заўсёды і езьдзяць.

— Хто? — пытаюся.

— Ну, гэтыя, такія, як ты...

...Вёска, нават напаўзакінутая, заўсёды выглядае неяк паўнавартасна. Коратка кажучы, тут жывуць людзі, якія тут нарадзіліся, і якія нарадзіліся, каб быць тут. Калі я езьдзіў зь кімсьці па раёне і раптам вяртаўся ў горад, заўсёды кідалася ў вочы гэтая вясковая натуральнасьць і «гумовасьць», нейкая прыкле-

енасьць да навакольля катэджных пасёлкаў і «крыху падноўленасьць» вёсак прыгараду. Што найбольш убілася з назіраньняў — бусьлянкі. Я амаль ніколі не заўважаў іх, сымбаляў шчасьця, нават на электраслупах, у гэтых, як іх называюць, «царскіх сёлах», дзе нібыта жывуць заможна і шчасьліва. Ня буду шмат пра дрэннае, але самай жудаснай ва ўсіх сэнсах «нацыяй» зьяўляюцца дачнікі. Бог, асьцярожнасьць ці што там яшчэ ратавалі мяне ад іх...

Як ціха, незваротна адыходзіць вёска! Неяк я быў у такой, на Ўшаччыне. Глухая, удалечыні ад дарог, адзьдзеленая лясамі, палямі, каналамі... Мы зь сябрам зайшлі ў адзін дом на ўскрайку. Дома як такога ўжо не было — у ім выпілілі сьцены. Засталіся толькі вянцы, на якіх нейкім цудам трымаўся дах. Я зайшоў праз такую сьцяну ўнутр. Печ са зьнятымі чыгуннымі засланкамі, сталы, лаўка, скрыня...

Сёньня часьцяком даводзіцца чуць аб разбурэньні гістарычных помнікаў, аб іх занядбаньні. Аб тым, як мала ім надаецца ўвагі і клопату. А хто будаваў тыя цэрквы і камяніцы? Я тады, стоячы пасярод гэтай «хаты», уявіў, як пячнік, які клаў гэтыя печы, паехаў у Лепель ці Ўшачы, як ён, адпрацаваўшы там, быў адрэкамэндаваны для працы ў губернскі Менск і клаў падмурак Чырвонага касьцёла, пра пачатак разбурэньня якога пачалі біць у званы і шукаць дапамогі. Памяць пра веліч-

ныя будынкі, пра фундатараў, уладальнікаў яшчэ хоць неяк захоўваецца. Імёнаў сялян, што мясілі гліну, вазілі лес і цэглу для будаўніцтва і рыштаваньняў, не аднавіць. Мо гэта і ня трэба. Але тое, што захоўвала для нас маўклівую памяць аб іх, таксама чыхсьці бацьках, паціху сыходзіць за гаспадарамі ў зямлю. Тым ня менш шукаць карані праблемы ніхто не зьбіраецца, бо на карані не загоніш турыстаў, каб выставіць на панэль нейкую чарговую адметнасьць нашага краю і па-сутэнёрску зарабіць на ёй.

Каб словамі можна было давесьці, што адчуваеш ад тых адметнасьцяў! Ад невялічкіх вясковых перакошаных лазенак, якія стаяць на краі вёскі сярод пустазельля; падыходзіш так зь лясной дарогі раніцай і бачыш у тумане іх дахі з дранкі ды крывыя цагляныя коміны, нібыта нейкае жытло чараўніцы ці хатка на курыных ножках, што прысела на адпачынак! Вясковыя хляўкі з шэрага дрэва; я дакладна памятаю зь дзяцінства, што яны былі самым улюбёным месцам для гульняў, і іх сьцены з вытачанымі шашалем іерогліфамі можна было вывучаць гадзінамі, як і невядомае рознае, Бог ведае зь якіх часоў кінутае гаспадарчае прычындальле.

Язык не паварочваецца сказаць, што вёска памірае. Яна вяртаецца да таго, з чаго была створана, сярод чаго існавала — вяртаецца да прыроды. Як горад, яна не наносіць такіх ранаў зямлі і навакольлю. Не застаецца

штучных валоў і равоў, зямля вольна дыхае, бо не забітая крышанай цэглай, моцнымі, велічнымі падмуркамі, тонамі жалеза...

Вярнуся да нас, тых, хто працягвае жыць на гэтых закінутых вёсках, езьдзіць па закінутых дарогах, суткамі знаходзіцца ў заціхлых пасьля кананады і гоману лясох.

# ЛЮДЗІ, ВЫВІХНУТЫЯ З СОЦЫЮМУ

Трэба заўважыць, што большасьць сапраўдных капальнікаў — людзі адарваныя, вывіхнутыя, як кажуць, з соцыюму. Асабліва гэта заўважна ў тых, хто ходзіць «па вайне». Менавіта таму іх так прэсуюць усе ворганы бясьпекі, прапагандысты, уся дзяржаўная машына агулам. Так, менавіта з гэтай прычыны, а не з-за нейкіх грудкоў іржы, што калісьці былі зброяй, ці напаўрасьцярушаных набояў, не прадказальных у сваіх паводзінах мін, патронаў ці гранат.

Няцяжка заўважыць, што ў любой як сучаснай дзяржаве, так і існаваўшай у апошнія два стагодзьдзі, выцясьнялася такое разуменьне, як асоба, чалавек, і замянялася азначэньнямі «соцыюм», «грамадства», «натоўп» ці іншымі формамі чалавечага статку. Пры гэтым ня мае істотнага значэньня, аўтарытарны, дэмакратычны ці нейкі іншы лад пануе ў краіне.

Некаторыя з калегаў па рыдлёўцы, ды і сам я, нейкі час тлумачылі (даволі блытана і няўпэўнена), нібыта іх адарванасьць ад грамадства выклікана патрэбаю бясьпекі, патрэбаю спакойна рабіць сваю справу і гэтак далей. Напраўду прычына тут хутчэй ня ў людзях, а ў соцыюме. Яна хаваецца ў

груньце, на якім ён трымаецца, — залежнасьці і страху.

Справа тут яшчэ ў тым, што людзі ў соцыюме добраахвотна ўсталёўваюць для сябе гэтыя залежнасьці — ад працы, сацыяльнага статусу, грошай... Добраахвотна ўсталёўваецца і страх згубіць усё гэта, але самы жудасны — згубіць канчаткова, назусім. Такое магчыма пры адной умове — сьмерці.

Асоба, што трапляе ў шокавыя, экстрэмальныя па сацыяльных мерках умовы, раптоўна пачынае бачыць, чаго каштуе тое бруднае павуціньне, у якое ён сам сябе захутаў. Менавіта бачыць, бо так ці інакш мы ўсе пра гэта ведаем, хаця б на ўзроўні падсьвядомасьці. Каб лепей давесьці, прывяду прыклад з такім паняткам, як любоў, да бацькоў хаця б. Мы можам адхінацца ад іх, іншы раз нават дрэнна аб іх думаць, але калі яны па нейкіх прычынах зьнікаюць з нашага жыцьця, мы разумем, што ёсьць сапраўднае пачуцьцё любові. Тое ж з павуціньнем. Ня ведаем, што такое залежнасьць? Што такое самастойнасьць?

Грошы нічым не дапамогуць на твані за дзясяткі кілямэтраў ад бліжэйшай касабокай хацінкі. Сацыяльны статус — гэта, прабачце, цыраванае фуфло, калі мерзьнеш пад восеньскай залевай, месячы наліплую на гумовыя боты палявую гліну, і ня бачыш усяму гэтаму канца-краю з-за сапраўднай вадзяной сьцяны безь якой-кольвечы мяжы і верхавіны.

Працаўладкаваньне ня дасьць сапраўднага пачуцьця волі, пачуцьця, што ўсё залежыць толькі ад цябе. Гэта і ёсьць сапраўдная свабода — калі ты адзін пасярод поля ці лесу, дзе напраўду пачынаеш разумець, што толькі ты можаш нешта зрабіць ці не рабіць нічога, што свабода толькі твая і толькі ты можаш даць яе сабе, і яе непрыманьне, жах перад ёю і ёсьць адзін са складнікаў соцыюму, што змушае нас захутвацца ў павуціньне залежнасьцяў... Страта залежнасьцяў — першая небясьпека для любой, нават самай дэмакратычнай дзяржавы.

Каб ужо збольшага расставіць кропкі над тым і, што часьцяком мільгаціць у аповедзе, — адчуваньнем страхаў. Іх прыручэньне — другі, ня менш важны складнік. Страх — больш натуральнае пачуцьцё для чалавека, да таго ж больш карыснае; зьяўляецца лепшым стабілізатарам і выпрабаваньнем для асобы. Галоўны страх з запаветных часоў — згаданы страх сьмерці, хоць яна і ёсьць самым непазьбежным наканаваньнем для чалавека, да чаго ня дрэнна было б рыхтавацца, памятаць, робячы кожнае дзеяньне ў жыцьці. Яна, у адрозьненьне ад грамадскіх установак, не супярэчыць ніякім законам прыроды.

«Ваеншчыкі» куды часьцей сустракаюцца са сьмерцю ці яе праявамі. Ня толькі з-за спэцыфічнасьці тэмы, але і па прычыне экстрэмальных умоў, прыродных напры-

клад, ці падчас працы зь непрадказальнымі і небясьпечнымі відамі трафеяў. Вось тут адбываецца самы зьнішчальны ўдар па «запаветным»...

Чалавек працягвае руку і глядзіць у вочы самому непазьбежнаму і вечнаму. Асаблівасьць тут не ў самім удары па страхах, а, так бы мовіць, у яго рухавіку, рухавік — прычына, а яна палягае ў тым, што ўсё здараецца праз зацікаўленасьць і задавальненьне ад справы, з дапамогай якой гэта адбылося. Але ўсё адно пачуцьцё страху не зьнікае, бо яго прычына працягвае сваё існаваньне побач з табой. Да яго проста прыстасоўваешся, прыручаеш яго. Сьмерць вучыць глядзець на навакольле, напрыклад, на тых жа людзей з павагай. Заўважыць такое можна ў «ваеншчыкаў» са стажам: яны цалкам апалітычныя, у адрозьненьне ад пачаткоўцаў. Часьцяком можна пачуць: «Што гэта ў вас за странная наклоннасць збіраць усё нямецкае (фашысцкае)?», «Чаго вас так цікавяць гэтыя бальшавікі?». Мне вельмі цяжка будзе растлумачыць ці, дакладней, давесьці, як пад уплывам усіх вышэйзгаданых фактараў узнікаюць падобныя канапна-прапагандысцка-дзявятамаяшашлычныя «разважаньні», але вопытны пошукавец проста ня зможа кінуць косьці, вырытыя з акопа, бо глядзіць менавіта на іх — як на былога чалавека і яго страчанае жыцьцё, а не на яго апазнавальныя знакі, якія ён некалі на сябе начапіў,

ці на якой мове ён размаўляў сваім даўно згнілым языком. Так, гэта менавіта сьмерць, яе подых, вучаць гэтаму. Гэты індывідуум з рыдлёўкай вельмі добра разумее і прыймае той факт, што праз некалькі хвілін можа падарвацца на супрацьпяхотнай міне, такой жа, з таго ж міннага поля, як і тая, што забрала гэтае жыцьцё, і яны абодва будуць ляжаць ледзьве не ў абдымках, ня моцна адрозьніваючыся нават зьнешне адзін ад аднаго... Будзе хоць сябар ці праваднік на тым сьвеце. Ну, панове, як тут абысціся без такой якасьці, як павага?..

Як скарачаецца кола магчымасьцяў ціску дзяржавы на асобу, якая хаця б часткова не залежыць ад яе падачак і забаронаў! Куды і як можа прымусіць павярнуць ці зьбегчы чалавека статак, які нясецца шалёным гуртом ад волі і свабоды?.. Аднак для большасьці, хто захоча выйсьці са статку, галоўнае пытаньне тут будзе ўсяго адно: «Ці трэба гэта вам?». Ня трэба стрыгчы ўсіх пад адзін грэбень. Некаторыя дамагаюцца посьпехаў, гледзячы на жыцьцё праз прызму соцыюму і натоўпу, атрымліваюць ад гэтага задавальненьне і бачаць у гэтым сэнс жыцьця. Праходзяць праз нейкія выпрабаваньні нарэшце.

Такое, напрыклад, пытаньне: чаму злодзеі ў фільмах выглядаюць так прывабна? Не, не з-за таго, што яны робяць, а як — яны ідуць па сваім жыцьцёвым шляху ўпэў-

нена, з асэнсаваньнем, што гэта іх шлях, брудны ён, пыльны ці які там яшчэ, але іх. Яшчэ адна з прычын згаданай вышэй «таўстаскурасьці» — звычка рабіць глупствы з сур'ёзным тварам. Мы ня ставімся да выпрабаваньняў як да чарговай спробы, як да гульні, лёгка і зь цікавасьцю, і не разумеем, што сьвет — сапраўдны калейдаскоп зь неверагоднай колькасьцю рознакаляровых шкельцаў, зь незьлічонай колькасьцю варыяцый іх становішчаў, і калі вы ня ў стане гэтага асэнсаваць, ня трэба пляжыць яго аб падлогу.

## ПРЫРУЧЫЦЬ СТРАХ

...Лес — агрэсіўны асяродак, што раскрывае перад тым, хто апынуўся ў ім, усе магчымасьці яго волі, уменьняў, увагі. Увагі аднаго чалавека недастаткова для такой велізарнай махіны і яе маўклівых, незаўважных на першы погляд магчымасьцяў, таму трэба мабілізоўваць усе свае рэсурсы, каб быць зь лесам на ты. Толькі зразумеўшы гэта, я асэнсаваў, чым былі мае пачатковыя страхі і напружанасьць: тлумачэньні пра зьвяроў, спэцслужбы ці блуканьні — танная шырма, якую так цяжка скінуць выхадню з соцыюму.

Калі я быў «на копе» з напарнікам, я яшчэ неяк мог дазволіць сабе паслабіцца ці выпусьціць назапашаную ў горадзе энэргію. Адбывалася гэта розным чынам. Акрамя самой засяроджанай ці цяжкай працы мы маглі крыху пасвавоhelp: валілі дрэвы ці пускалі з крутых схілаў валуны, рабілі кастры з «масьлят» ці «цьвікоў», артылерыйскіх «макарон» і «цвайн картушэнаў», а сустрэтага раптам зьвера маглі давесьці ледзьве не да паляруш нечалавечымі крыкамі з розных бакоў і бразгатам сякер аб рыдлёўкі. Толькі там мы маглі «разэнэргеціцца» на сто адсоткаў. Так глухі вялікі лес, хаваючы і прымаючы нас, патроху рабіўся звыклым і неяк больш сяброўскім.

Што зьмяняецца яшчэ? Асабісты пагляд на рэчы. Пасьля прыручэньня страху ён перастае быць павязкай на вачох. Напрыклад, калі раней я езьдзіў зь некім на машыне па начной дарозе, то вельмі спадабалася абароненасьць ад цемры, холаду, розных начных гукаў, туманных постацяў на даляглядзе... Сёньня тое адчуваньне замененае прагай быць там, у навакольлі, браць удзел у такім загадкавым і разнастайным у праявах начным жыцьці, ісьці разам зь ім па дарозе, што ахоўваецца постацямі, даведацца, пазнаёміцца з тым, аб чым спрабуюць распавесьці гукі ў цемры, якая хавае таго, хто іх выдае, менавіта затым, каб ён і запомніўся толькі адным са сваіх шматлікіх абліччаў — гукам. У агромністым асяродку пачынаеш заўважаць кожную яго асаблівасьць, кожную асобу ў ім. На практыцы такое назіраецца ў сапраўдных капачоў зь вялікім стажам, вопытам і здольнасьцямі карыстацца ім; між іншым, згаданыя якасьці ёсьць аднымі са складнікаў так званага «нюху». Ізноў узгадалася практыка з такога невялікага ў параўнаньні зь лясамі ды палямі калегіюму. Акрамя пагляду на рэчы, іх успрыманьне, тое ж нічым непрыкметнае поле і напраўду чым толькі не нашпігаванае!

У лесе, у навакольлі столькі асобаў! Дрэвы, птушкі, нейкія фрагмэнты ландшафту... Бязмоўная гутарка з навакольлем столькі перадае ў адрозьненьне ад звычайнага парожняга балбатаньня! Асабліва гэта тычыцца

дрэваў, іх галін у розную пару года, на розным фоне неба.

...Такія дрэвы, як дубы, ліпы ці клёны, акрамя таго што растуць каля людзкога жытла, часта зьяўляюцца сьлядамі чалавечага бытаваньня, таму з успрыманьнем іх яшчэ больш-менш зразумела. Дубы сталі такім звыклым маркерам хутарышчаў, што нават адзінкавы дуб у лесе ці гай на ўскрайку поля ствараюць пачуцьцё абжытасьці. А вось каб атрымаць нейкія незвычайныя ўражаньні, прыкладам у дубовым ці ліпавым гаі, я заўсёды гляджу праз гальлё на неба. Не мастак я, не мастак, хоць агулам аб гэтым і не шкадую, але ня супраць быў бы намаляваць, калі аднойчы падчас начоўкі сярод такога гальля, на якое былі нанізаныя кроплі вечаровага дажджу, падсьвечаныя сьвятлом месяца, можна было назіраць за зоркамі на ясным небе. Зыркі і халодны бляск. Нібыта гэтымі словамі і ўсё сказана. Гледзячы на неба і гэтыя бліскучыя кропкі, я пачуў вымаўленае імі бяз слоў празь цемру: «Бачыш ты ня толькі вачамі». Я хацеў запярэчыць. «А як ты адрозьніваеш кропкі яскравага халоднага сьвятла — што зь іх зоркі, а што кроплі?»

Пад Полацкам, па абодвух берагах Дзьвіны, хапае сасновых бароў. Калі стаіш пасярод такога, дрэвы здаюцца запалкамі — танюткія, высачэзныя, панатыканыя ў зямлю, яны гойдаюцца пры самым слабенькім ветрыку. Але мне куды больш падабаюцца,

як я іх называю, ушацкія сосны. Яны растуць на схілах халмоў, клясычна так, канешне, па дзьве: нізкарослыя, з шырокімі прыплясканымі кронамі, і самі яны крэпкія і карчакаватыя. Кара на іх не раўня «паперцы» баровых соснаў, гэта сапраўдная тоўстая браня, тэрмаізаляцыя... Захапляюць і асобныя сосны, калі яны растуць у ляшчынніку. Я не змагу растлумачыць чаму, але разумею, па якой прычыне нашыя продкі лічылі ляшчыну сьвятым дрэвам. Адчуваньні ў такім восеньскім гаі пры тумане нават ня варта пэцкаць тлумачэньнямі. Такое мажліва і трэба толькі адчуць самому.

Адпачываючы дзе-небудзь на высьпе сярод балота, калі бегаеш раньняй вясной па лесе за Гансамі, заўсёды падабаецца глядзець на верхавіны бяроз — голыя ці якія толькі пачынаюць зелянець. Калі балота напраўду глухое, удалечыні ад дарог, вёсак, чыгункі, іх бясшумнае гойданьне на вясновым небе чамусьці выклікае нейкае асабліва моцнае пачуцьцё суму ды адзіноты. У такія хвіліны ў мяне заўсёды ўзьнікала адно пытаньне: калі ўявіць, што тут так сумна самому, тутэйшаму, цікава, як глядзелі са сваіх акопаў на гэтыя верхавіны тыя, хто прыйшоў сюды за тысячу кілямэтраў ад свайго дому, каб пасьля ўзіраньня ў гойданьне гальля на чужым небе, што разрывае сэрца, глядзець у вочы сваім выпрабаваньням?

Большасьць чытачоў, калі іх запытаць: «Дзе паскудней за ўсё заблукаць?», — адкажуць: «У лесе». Гэта зусім ня так. Самае безнадзейнае — заблукаць у лазовым кустоўі. Ніякіх арыенціраў. Ніводнага высокага дрэва, каб забрацца і паглядзець на бяскрайні забалочаны поплаў, які парос лазой. Аднастайнасьць навакольля стварае адчуваньне, што ходзіш па коле, і выклікае павольнае, напаўзаючае пачуцьцё панікі... Аднак калі не блукаць па такім забалочаным поплаве, а прыйсці на яго, каб пашпацыраваць паміж лазовых купак, паміж заўсёды празрыстых лужынаў з травой на доле і выйсьці да чорна-карычневага з балотнай вадой ручая!.. А калі па восені, падчас бабінага лета!.. Мне асабіста падабаецца ўсесьціся на ручаёвым беразе, каб папіць моцнай чорнай гарбаты, ці калі я пасьпеў перад выездам заварыць чыфіру, то яго. Дзеля гэтай сьвятой справы я неяк адабраў у нашага шаноўнага «Эўраопта» цудоўнейшы кубачак з празрыстага шкла. Увесь кайф у тым, калі трымаеш яго перад сабой напаўвыпіты, а вада з ручая сваім колерам «далівае». Моцная гарбата дае і гарчыню, падобную да гэтай вады. Аднойчы неяк давялося пакаштаваць такога цуду, прытым у найлепшым варыянце: на Гарадоччыне, дзе лес амаль цалкам складаецца з алешыны ды асіны, апалае лісьце і паваленыя дрэвы ствараюць настой з чароўнейшым водарам! А на смак! Калі ня выпіць гэта залпам, адчувань-

не — нібыта вось-вось пасыплюцца зубы, бо дзясны і нёба скукожваюцца і ссыхаюцца з-за гарчыні. Зубы на паліцу, карацей...

З дрэваў яшчэ вельмі запомніліся вербы. Ня ведаю, як у каго, а ў мяне яны заўсёды асацыяваліся зь вёскай. Іх ускраіны, полеразмежавальныя палосы і асушальныя каналы заўсёды былі абсаджаныя імі, таму, калі здалёк бачу шэрагі вербаў, заўсёды ўзгадваецца вёсачка. Асацыяцыі зь вёскай?.. Дзяцінства, сваякі і бацькі, пустая халодная хата?.. Я даўно страціў падобныя адчуваньні, бо звыкся глядзець на вёску зьверху. У літаральным сэньсе. Узгоркі Віцебшчыны і паселішчы пад імі дазваляюць гэта.

Калі на такім узгорку расьце лес ці кустоўе, выходзіш на яго ўскраіну і бачыш пад сабой тыя самыя вербы, дахі хат, прастакутнікі агародаў... Вецер даносіць астатнія складнікі вёскі. Гэта пах дыму з коміна і паленага бульбоўніка, скошанай травы, брэх сабак. Толькі вецер неяк дзіўна рашчыняе ў сабе ўсё гэта, робіць мяккім, каб успрымаць усё ненавязьліва і мець магчымасьць непакутліва, не хапаючы, увабраць у сябе данесенае. Там зьнізу кіпіць жыцьцё, якое чамусьці пачынае пры такім назіраньні выклікаць нейкую шалёную радасьць за тых, хто там працуе, лянуецца, бухае, адпачывае...

Я з боку маўклівага цёмнага лесу назіраю за гэтым, назіраю зь іншага, з таго сьвету. Вось што напраўду значыць гэтая фраза! Я

ведаю, што не пайду з таго сьвету да той вёскі — не таму, што нельга — мне проста ня трэба. Адсюль я добра бачу і адчуваю яе, ня хочацца перапыняць гэтае адчуваньне, нават хочацца болей! Ня буду хлусіць самому сабе, я ж такі адасобленік, пайду потым у свой лес выпрабаваньняў і падыду да ўзьлесься, калі трэба набрацца сіл і адпачыць па-свойму.

Гледзячы такім чынам на наваколье, напачатку думаў: «Як плоска мы глядзім на сьвет. Дрэвы — нібыта яны толькі для распалу, ачышчэньня паветра, прыгажосьці? Нібыта адчуваньне таго, што гэта ня так, ня можа само па сабе прасьвятліць нашае нутро, каб глядзець неяк па-іншаму. Для мяне каталізатарам да тых зьменаў стаў страх. Бо якія яшчэ пачуцьці могуць стаць штуршком? І як гэта — зьмяніць успрыманьне праз іх?»

Старажытныя, забытыя паганскія багі, духі ці істоты, малітвы соцень людзей з укладзенай у кожнае слова верай, альбо нешта не зразумелае нашаму сучаснаму розуму, што не паддаецца нашаму ўспрыйманьню, неяк умеюць захоўваць наваколье, атмасфэру вакол паклонных камянёў, на былых капішчах, царкавішчах, прошчах. Узгадалася пра гэта каля вялікага чырвонага гранітнага валуна, што ляжаў на ўскрайку поля. У яго чашападобную западзіну сядала сонца, як і тысячу гадоў таму. Тысячу гадоў! Дваццаць-трыццаць пакаленьняў, барацьба з паганствам, барацьба з рэлігіяй, зь мяс-

цовымі жыхарамі... Тысячу гадоў поле, на ўскрайку якога тысячу гадоў валун, у ахвярнік якога ўжо тысячу гадоў багі самі прыносяць у ахвяру закаты...

Некалі іх стоды, пасечаныя на дровы, палалі на былых малельнях ці плылі па рэках. Вогнішчы ў іх гонар згасьлі, рэкам і крыніцам не прыносілі дароў. На закапаных пад зямлю, залітых асфальтам і бэтонам падмурках былых храмаў, што стаялі ў гарадах, так ці інакш паўстаюць новыя, нягледзячы на крызісы, абыякавасьць, усім падобным перашкодам насуперак. Калі фізычная сьмерць — канчатковае зьнікненьне, чаму крумкачы заўсёды лётаюць над былымі вёскамі, могільнікамі? Бачаць само жыцьцё, пакінутае, складзенае на родныя мясьціны самімі ўладальнікамі? Ліпы каля вясковай хаты, памятныя зь дзяцінства, заўсёды кішэлі імі, але да нашай хаты яны прыляталі па адным, незаўважна, і толькі за куранятамі.

Зязюлі ў лесе звычайна палохалі сваім раптоўным куваньнем. Ці проста надакучвалі. Прыемным іх сьпеў быў толькі калі чуўся здалёк, і перарывістыя ку-ку, ку-ку... зьліваліся ў адзін цягучы гук. Маімі ж улюбёнымі птушкамі былі так шмат тут згаданыя крумкачы. Нават іх раптоўнае зьяўленьне, карканьне ці шоргат крылаў не палохалі: рэха ад іхніх крыкаў асабліва прыгожа чулася ў зімовым, пакрытым сьнегам лесе, ці па раньняй вясьне, калі яны пяшчотна і

павольна кружлялі над полем па веснавым блакіце неба, зьбіваючыся ў чароды, а чароды распадаліся на асобныя чорныя кропкі. Мо звыкся зь дзяцінства?

Аднак я пачынаю адчуваць нейкія скосыя пагляды пабочных пры размове асобаў. «Што ты тутака гэта пляцеш? Ты распавядай давай пра тое, колькі золата выкапаў, колькі каштуе Жалезны крыж, куды ўсё падзеў?»

Так, дагэтуль размова ішла пра сутнасьць справы, болей паміж калегамі, чым з засумавалымі пабочнымі прысутнымі. Абалонка — рэч таксама істотная, хоць, паўтару, распавядаю я пра ўсё ва ўласным стылі і са сваімі акцэнтамі ў справе.

## «ХАБАР»

...Калі я пачынаў займацца сваімі пошукамі, галоўнымі для мяне былі знаходкі, «хабар» — калі на жаргоне. Манэты, падвескі, спражкі, шпількі, пярсьцёнкі, таварныя пломбы, пячаткі, крэсівы і наканечнікі стрэлаў... Хацелася мець усё. Штосьці я знаходзіў сам, штосьці выменьваў на некаторыя рэчы ў калегаў, але ў мяне ніколі не было прагі ці задавальненьня ад куплі-продажу, хоць зрэдку я па магчымасьці і набываў некаторыя рэчы. Зрухі ў адносінах да артэфактаў паклаў вышэйзгаданы «кубік Рубіка» — калегіюм. Там вельмі выразна было бачна, колькі мы страчваем гістарычных каштоўнасьцяў з-за рознага кшталту недахопаў, памылак, вандалізму і гэтак далей. Страты — заўсёды рэч незваротная. Іх можна замяніць нечым падобным, аднолькавым, але што страчана — тое назаўсёды. Са сьлядамі мінулага ўсё яшчэ горш. Таму пазьней я пачаў ставіцца да сваіх збораў як да таго, што будзе захавана безумоўна, пры любых абставінах: зьнікала драўляная забудова Полацка, расьцягваліся на цэглу маёнткі і цэрквы на вёсках, выкарчоўвалася нутро калегіюму, але я сам магу захаваць нейкія рэшткі, знойдзеныя мной, любоўна адрэстаўраваныя і не па танных прамовах каштоўныя для мяне.

Аднак рэчы — далёка не адзінае, што захоўвае гістарычную памяць. Куды каштоўней інфармацыя, якую яны нясуць. У гэтым, да слова, археалёгія падобная да крыміналістыкі: актэфакты й ёсьць рэчдокі. Таму зь цягам часу я пачаў захоўваць і інфармацыю аб сваіх знаходках, што апошнім часам прыносіць куды большае задавальненьне. Знаходкі нібыта выяўляюцца наноў, калі яны з «проста прыгожых», «прышпільных» цукерачных фантыкаў ператвараюцца ў сапраўдную гісторыю на далоні. Звычайна такое стаўленьне выклікае ў калегаў па рыдлёўцы ўсмешку, але тут ёсьць што адказаць і ім, і тым, хто правароніў момант з ператварэньнем звычайнага хабарнага землякопства ў асэнсаваны і карысны розным бакам пошук.

Змацаваньнем для такой формы магло б стацца краязнаўства. Карэнныя зьмены ў адносінах да хабару — проста кавалкаў мэталу на паліцы, у стале ці пад ложкам, на рэчы са сваіх ваколіц, якія ляжалі б побач зь сямейнымі фотаальбомамі, дакумэнтамі, рэчамі... Калі, напрыклад, нехта з прашчураў нарадзіўся на тым жа двары, дзе стаіць уласная хата, то звычайная мікалаеўская капейка, у любым стане захаваньня, становіцца замест «шмурдзяка» невялікай такой спадчынай, прадметам, што калісьці згубіў сваяк ці госьці, якія прыяжджалі да яго на баляваньне. Зразумела, гэткая матывацыя зрушыць і да астатніх формаў даследаваньня сваёй

гісторыі, адносінаў да знаходак, узаемаабмену інфармацыяй.

Аднак чаму ж не адбылося падобных зьменаў? Чаму ўсё ў разглядаемай справе так заблытана? Адказ, як і вырашэньне праблемы, болей чым просты: у адрозьненьне ад папер, дакумэнтаў, падручнікаў зямля можа даць праўдзівыя і ўсебаковыя адказы на спрэчныя ці невядомыя пытаньні. Вышэй згадвалася, як атрымліваецца свабода пошукавікамі і пра яе наступствы. Дык якому дзяржаўнаму ладу патрэбны свабодны чалавек, які хоча і можа ведаць, уласна здабываць веды? Уласна карыстацца здабытым і мець жыцьцёвы вопыт з пошукаў, глядзець праз яго на навакольныя падзеі? Мець гонар і ведаць, колькі стагодзьдзяў апрацоўваў зямлю пад нагамі яго сваяк і як завецца ўмова на права валоданьня ёю?

Што да адносінаў паміж «чорнымі капальнікамі» і археолягамі, то хочацца ўспомніць адну фразу, якая бытуе збольшага ў першым са згаданых колаў: «на рыдлёўцы ўсе сыдуцца». Прычына тут у адзіным корані, зь якога паходзяць абодва напрамкі.

Як агулам зарадзілася сучасная археалёгія? Пачыналася ўсё са звычайнага марадзёрства, якому ўжо ні многа ні мала за 5 тысяч гадоў і якое ўзьнікла ў старажытным Вавілёне, існавала ў скіфаў і аланаў. У XIX ст. набывае моду хатняе калекцыянаваньне, экспанаты для якога здабываліся з

дапамогаю раскопак курганоў, якія няцяжка было выявіць і мецъ упэўненасьць у выніку раскопваньня. Зь цягам часу, аднак, паўстала патрэба ў разьвіцьці справы, таму акрамя здабываньня «фантыкаў» пачалося навуковае вывучэньне курганоў.

Калі мне даводзілася чытаць ці чуць нешта аб бюракратыі ў былой Расейскай Імпэрыі, то стваралася ўражаньне, што яна была пабудаваная на даволі простай і трывалай мадэлі: хто плаціць, той і музыку замаўляе. Што за музыка — не істотна, галоўнае, каб плацілі.

Тагачасная інтэлігенцыя, падобна, карысталася гэтым становішчам напоўніцу: нягледзячы на небясьпеку ад распрацоўкі і асьвятленьня пытаньня аб паходжаньні беларусаў, украінцаў, латышоў і літоўцаў, працы на гэтую тэму зьяўляліся, дапаўняліся і крытыкаваліся ў паўстаючых навуковых колах напоўніцу. Ну, як кажуць, у добрага чалавека і дрэнныя рэчы служаць добра — так што карупцыя і марадзёрства былі выкарыстаныя не дарма. Галоўнае — мудрасьць тых навукоўцаў, яны накіравалі ўсё ў патрэбнае рэчышча; ведаючы аб цікавасьці і памкненьнях людзей да пошукаў скарбаў, празе да багацьця, яны проста павярнулі прыярытэты гэтай справы на свой бок, на чым і пабудавалі падмуркі сёньняшняй археалёгіі.

Сучасная археалёгія безь істотных зьменаў зьяўляецца пасьлядоўніцай той, што зарадзілася 200 гадоў таму. Яна збольшага

грунтуецца на візуальным выяўленьні помнікаў археалёгіі — гарадзішчаў, курганоў, і дасьледаваньні ўжо вядомых аб'ектаў. Мэталапошук, тэарэтычна, мог бы стаць новым вітком у справе. Зь яго дапамогай лягчэй выявіць хутарышчы, зьніклыя дарогі, селішчы, месцы бітваў, ад якіх на паверхні амаль ня маецца ніякіх сьлядоў. Аднак маем што маем, таму сучасныя археолягі, аматары мэталапошуку, марадзёры, краязнаўцы, рознай накіраванасьці гісторыкі ня маюць сёньня ніякай узаемакарысьці, і галоўнае — руху хоць у нейкім кірунку.

У даважак большасьць хутарышчаў, селішчаў, якія і ёсьць асноўным аб'ектам пошукаў, маюць нязначныя па магутнасьці культурныя адклады, іх таўшчыня вагаецца ў межах 0,2—0,6 м. Пры распрацоўцы ворыўных плошчаў цягам 20—40 гадоў, з-за пашкоджаньня тэхнікай і асяданьня глебы пласты «сьціскаюцца»: прыкладам, мне даводзілася працаваць на былым засьценку, дзе цудам захаваліся некранутыя напластаваньні ў 0,6 м шчыльнага, насычанага камянямі і крышанай цэглай слою. На ворыве, праз нейкія 15 сантымэтраў ад краю шурфа, ён ледзьве дасягаў штыка звычайнай рыдлёўкі; вядома, там былі зьнішчаныя стратыграфічныя дадзеныя, нават такія аб'екты, як мацерыковыя ямы і паглыбленьні. Адзіным паратункам у такім становішчы на ворыўнай плошчы таксама зьяўляюцца мэталапошук і паверхневыя зборы.

## СТЭРЭАТЫПЫ АБ КАПАЛЬНІКАХ

Цікавым момантам ёсьць і побытавыя стэрэатыпы аб капальніках і іх справе. Першы — аб незьлічоных скарбах і каштоўнасьцях, нібыта здабываемых пошукавікамі. Калі нехта пачынае даводзіць мне аб такіх рэчах, заўсёды ўзнікае жаданьне запытацца: «Колькі кашалёў з далярамі за гэты год ты выкінуў у сьметнік?», «Колькі смартфонаў кінуў у траву з-за таго, што несьці цяжка было?». Большасьць знаходак, калі перавадзіць іх у сучасныя рэчы, — гэта гузікі з кашуляў, клёпкі ад джынсаў, розная біжутэрыя шырокага ўжытку ці ўвогуле сьмецьце кшталту пластыкавых бутэлек альбо бляшанак ад кансэрваў ці піва. Я не асабліва ведаю статыстыку, калі такая і існуе, але больш-менш каштоўныя знаходкі будуць складаць недзе ня болей за 10 адсоткаў ад агульнай колькасьці, а адносная распаўсюджанасьць на інтэрнэт-форумах тлумачыцца тым, што менавіта іх, як найбольш яскравыя, выстаўляюць для азнаямленьня, атрыбутацыі ці на абмен.

Коратка спынюся і на такой тэме, як гандаль рарытэтамі. Такое азначэньне не зусім дакладна адпавядае становішчу: пад продажам, ці калі шырэй — гандлем, хаваецца абмен на грошы як на найбольш унівэрсальны

сродак. Большасьць капальнікаў займаюцца накіраваным зьбіраньнем рэчаў: пярсьцёнкі, культавыя рэчы, паясавы набор, нумізматыка... Таму абмен на ўнівэрсальны сродак дзяля спрашчэньня падобных апэрацый тут апраўданы. Іншая рэч — вываз артэфактаў за межы краіны.

Тут таксама куды болей стэрэатыпаў, чым адлюстраваньня фактаў. За мяжу, улічваючы рызыку ці выдаткі на афармленьне, вывозяць у асноўным антыкварыят, бо нешматлікасьць і нестабільнасьць паступленьня камерцыйна каштоўных рэчаў ад капальнікаў адхіляе тых, хто займаецца падобным бізнэсам. Каталізатарам для продажу паміж самімі капачамі зьяўляецца зацікаўленасьць, а яна, па аб'ектыўных прычынах, галоўным чынам залежыць ад, так бы мовіць, рэгіянальнасьці.

Мне самому даводзілася бачыць на інтэрнэт-аўкцыёнах высокамастацкія па выкананьні элемэнты анцкага паясавога набору са срэбра, якія спрабавалі прадаць у Беларусі, але попыт на іх не падвысіўся, нават калі пачалі «дубасіць» па коштах. Тое ж адбывалася нават з аналягічнымі, куды больш рэдкімі рэчамі з Крыму, але зробленымі ўжо з золата, з эмалямі і ўстаўкамі з каштоўных камянёў. Ды што там пра Крым, калі нават знаходкі па раньнесярэднявечных упрыгожаньнях з Паўночнай Беларусі, што цалкам адпавядаюць балцкім, не выклікаюць зацікаўленасьці на Палесьсі, дзе ў тыя часы

больш панавала славянская матэрыяльная культура.

Але ня буду асабліва на гэтую тэму, бо тут я ня вельмі дасьведчаны, дый свае адносіны да «копу» і знаходак, адносіны да справы агулам я выказваў вышэй.

Калі коратка спыніцца на шкодзе, якая наносіцца гістарычнай спадчыне, то тут таксама «на рыдлёўцы ўсе сыдуцца». Шкода ад марадзёраў ці парушальнікаў заканадаўчых нормаў цалкам адпавядае стратам ад дзейнасьняў «гісторыкаў»-кар'ерыстаў, якія, каб ня мець праблем, не зьміргнуўшы вокам падпісваюць паперкі аб адсутнасьці гістарычнай каштоўнасьці будынкаў узростам 1,5—2,5 стагодзьдзя ці аб зрыцьці часткі гарадзішча пад ЛЭП альбо дарогу.

Збольшага ўяўленьне аб капальніках фармуюць СМІ, асабліва пра пошукавікаў па вайне. Ня буду займацца іх выкрыцьцём ці апраўданьнем, дадам толькі некалькі фактаў.

Існуе міт, што большасьць ваенных трафеяў — з магіл ці трупаў. Уся ваенная прадукцыя таго часу — шырспажыў на адзін раз, таму якасьць яе выкананьня даволі нізкая. Сплавы, зь якіх рабілі жаўнерскія кацялкі, флягі, каскі, і ў добрай зямлі захоўваюцца ня вельмі добра. Хімічныя рэакцыі пры тленьні цела паскараюць і павялічваюць моц такіх працэсаў, таму рэчы з трупаў амаль заўсёды захоўваюцца як кавалкі мэталёвага тлену. Гэта тычыцца нават каразійнатрывалых

сплаваў манэт, асабістых рэчаў ці ўпрыгожаньняў.

Узнагароды, большасьць зь якіх складаюць так званыя «абцайхены», то бок кваліфікацыйныя знакі Германіі, за штурм, раненьне і таму падобныя, рабіліся з «крыгсмэталу» на грунце цынку, таму яны ніколі не трапляюцца бязь нейкіх рэльефных ці контурных стратаў нават у нізкакіслотнай глебе.

Знаходкі па вайне выяўляюцца збольшага ў верхніх дзірванных пластах глебы. Гэта згубленыя ці наўмысна кінутыя падчас сутыкненьняў ці манэўраў рэчы. Пры глыбінным пошуку найлепшы вынік дае раскопваньне рэштаў жылых памяшканьняў: зямлянак, бліндажоў, ямаў пад палаткі.

Байкі пра зброю, трэба заўважыць, нясуць немалую долю праўды, але ёсьць адно але: яны адносяцца недзе да 60—80-х гадоў мінулага стагодзьдзя. Як у вяскоўцаў, так нават і ў розных дурняў з гораду ўжо ёсьць ці вопыт, ці разуменьне: калі ня хочаш, каб набой даведаўся, што ў цябе ўнутры, ня трэба высьвятляць, што ўнутры ў набоя.

Па-першае, боепрыпасы 70—80-гадовай даўніны не падыдуць да сучаснай зброі. Па-другое, калі па тэлевізіі вы бачыце прыгожы малюнак, дзе выцягнутая сапёрамі мінамётная міна з балота захавала фарбу і надпісы, то гэта ня значыць, што яна ўсё яшчэ мінамётная міна. Нямецкая прадукцыя часоў вайны, прызначаная менавіта для армейскага

карыстаньня, — ад шкарпэтак да рэактыўнага самалёта — мела тэрмін прыдатнасьці ў 25 гадоў складскіх умоваў захаваньня. Зь нямецкай акуратнасьцю, пры зыходзе тэрміну ці неспрыяльных умовах, яна пачынала псавацца: боепрыпасы станавіліся альбо небаяздольнымі, альбо непрадказальнымі ў паводзінах. Прычына — нямецкая выбухоўка ці дэтануючыя рэчывы былі выраблены зь сінтэтычных матэрыялаў. Праз тыя 25 гадоў патрэбных умоваў захаваньня ўсё адно пачыналіся хімічныя рэакцыі, а цяпер уявіце тое ж, але з захаваньнем гэтай дрэні пры рэзкіх перападах вільготнасьці, тэмпэратуры, рэакцыях з мінэральнымі ўтрыманьнямі ў глебе?..

Савецкія боепрыпасы хоць і начыняліся больш прымітыўнай выбухоўкай, вобразна кажучы, з гаспадарчага мыла і салетры, небясьпечныя з-за якасьці. Галодныя ленінградскія дзеці наўрад ці маглі вырабіць замерзлымі рукамі без патрэбнага вопыту і навучаньня нешта прыдатнае для зброі, куды болей тое падыходзіла толькі для кадраў прапагандысцкай кінахронікі.

Між іншым, самі ветэраны неаднойчы ўзгадвалі ў мэмуарах аб падобных здарэньнях. Мне асабліва яскрава запомніўся выпадак з кнігі нямецкага шарагова жаўнера Бэна Цызэра «Дарога на Сталінград», дзе ён распавядае, як падчас рускага артабстрэлу набоі траплялі ў кінутыя ракеты для кацю-

шаў, але яны не дэтанавалі з-за пашкоджанасьці трыццацігадуснымі маразамі.

Што да зброі... Асабіста мне на вочы трапляліся толькі нейкія вырабы зь яе. Пасьля вайны рукастыя мужыкі не ў апошнюю чаргу цягнулі яе дахаты, каб нешта змайстраваць для гаспадаркі: нейкія засаўкі, мэханізмы... Тут лепей падыходзіла менавіта савецкая, бо яна была зь якаснай сталі і яе можна было апрацаваць на саматужных станках і абточках. Нямецкая, з моцналегіраваных сталяў для той справы была непрыдатная. Канешне, наўрад ці хто з тагачасных маладых хлопцаў, браканьераў ці каго падобнага, грэбаваў бы і яе прамымі функцыямі. Але каб зразумець канчаткова сучаснае становішча са зброяй таго часу, паназірайце ці паразмаўляйце з паляўнічымі, што наладжваюць свой рыштунак перад выхадам у лес. Як яны сочаць за збоем кожнай дзясятай долі міліметра кольцаў у ствале ружжа, наладжваюць прыцэлы... Шырокаму колу нядрэнна было б дзеля параўнаньня пабачыць і ракавіны ў ствалах трохлінеек, і скразныя «сьвішчы» ў іх магазіне.

Аднак чаму рыштунак і асабістыя рэчы, тэарэтычна патрэбныя (у нас жа ўсё калі-небудзь куды-небудзь і прыдасца), працягваюць ляжаць у лесе ледзьве не на паверхні? Вядома, пасьля вайны людзі баяліся нават блізка падыходзіць да месцаў баявых дзеяньняў з прычыны падарвацца на нейкай

гідоце, а таксама і шматлікасьці галоднага звяр'я, што кармілася з палеглых...

Незабыўная бабуля з-пад Віцебска, што дала нам мянушку дуркуватыя, распавядала, як сапёры вымушалі хадзіць цывільных толькі па агароджаных калючым дротам сьцежках, і іх забароны не былі нейкай шызой, у чым упэўніваліся тыя, хто выжыў побач зь іх парушальнікамі. Па гэтай жа прычыне мясцовыя вымушаны былі начаваць пад адкрытым небам, хоць кінутых цёплых і трывалых зямлянак было колькі заўгодна. Кожны, хто бываў у такім лесе з мэталюшнікам, пацьвердзіць, што размінаваньне гэтых месцаў скончылася яшчэ 40—50 гадоў таму. Лясы Паўночнага Ўсходу, разам з той закінутасьцю, прыгнятальнай балотнай пустэчай, абцягнутай пахам сьмерці палеглай травы, пад нагамі, найболей гостра стваралі тое «пачуцьцё вайны».

# СЬМЕТНІЦЫ АДКРЫВАЮЦЬ УСЕ ТАЯМНІЦЫ

Да больш прыемных рэчаў, надакучыла ўжо пра мярзоту розную... Дык вось, асобная тэма — сьметніцы. Гэта сапраўдны вырай як для любога археоляга, так і капальніка. Тут ужо, безумоўна, кожны знойдзе тое, што шукае: ад featureнага цікавага барахла да інфармацыі пра колішніх прысутных тут асобаў. Іншы раз, падчас самастойных раскопак сьметніц, узнікала пачуцьцё жалю, што побач няма мацёрага такога журналюгі-«жаўтушніка»! «Са-а-амыя надзейныя сьведчаньні і пікантныя падрабязнасьці оргій обэр-фэльдфэбэля Ганса і унтэр-лейтэнанта Фрыдрыха ў лясох Віцебшчыны!»; «Вам цікавыя матэрыяльнае становішча і моманты з пагулянак шляхціча N і Вайтоўскага?!» Усе падрабязнасьці іх паўсядзённага побыту, усё тое, што гэтыя асобы хацелі забыць ці схаваць, што ім было патрэбна і ад чаго яны пазбаўляліся, лепей за любыя фаліянты і архівы захоўвае зямля і гэтыя вось ня вельмі (хаця зь якога боку глянуць) прыемныя аб'екты. Так, іншы раз, канешне, узьнікае разуменьне, што павага да асобы ўсё ж павінна захоўвацца, таму хай застаецца такая сабе «лякарская таямніца», і я ня буду дужа распавядаць пра канкрэтныя выпадкі, але распавяду пра агульнае становішча,

пра інфарматыўнасьць такога калупаньня ў сьмецьці.

У маёй вёсцы мне шмат разоў па просьбах і так, самі па сабе, распавядалі аб пасьляваенным жыцьці, аб голадзе, ды і пра саму вайну часьцяком. Згадвалі і аб партызанах, якія, па афіцыйным меркаваньні, нібыта былі «народнымі мсьціўцамі», «звычайнымі калгасьнікамі зь вёсак».

Мне неаднойчы даводзілася весьці пошукі на месцах дыслакацыі партызан, і вось гэтыя сьметніцы ці проста кінутае барахло ў зямлянках дадавалі шмат цікавых падрабязнасьцяў аб іх побыце.

Што тычыцца дробнай амуніцыі, зброі і алкаголю, то тут яны напраўду куды болей надавалі ўвагі нямецкім трафеям. А з харчаваньнем, адзеньнем... Ніхто ў нашай вёсцы ніколі не згадваў аб ленд-лізе: аб распушчальных канцэнтратах для напоеў, кшталту сучасных юпі, тушонцы ў паўкіляграмовых бляшанках, парцыённых сардзінах з аліўкамі партугальскай вытворчасьці, кансэрваваных пэрсіках і ананасах... Пры гэтым бляшанкі ад правізіі ня тое што ня рэдкасьць, імі ў літаральным сэньсе нашпігаваная ўся зямля на партызанскіх «стойбішчах», іншы раз здаецца, нібы там іх болей, чым аскепкаў ад набоеў ці гранат. Канадскія, ангельскія, імпартаваныя з ЗША гузікі ад шынэляў ці рэшткі самой тканіны ў перакрытых ад кіслароду ніжніх слаях запаўненьня зямлянак

таксама ня ёсьць рэдкасьцю ў партызанскіх зонах. Нешта наш народ, што па клічы партыі змагаўся ў тых лясох, падобна, ня вельмі памятны на такія рэчы ў ваенныя часы, а ўсё нешта сьцеле як ліс хвастом, цень на ясны дзень наводзіць, пра голад і нішчымніцу ў шчасьлівым партызанскім жыцьці.

Марадзёрства таксама было звыклай справай для «народу зь лесу». Зь яго дапамогай зьвязы забясьпечвалі сябе трафейным сталовым начыньнем, якасным парцалянавым посудам, вырабамі з каштоўных мэталаў. Ну не сакрэт, што большасьць са здабытага мсьціўцамі паходзіла менавіта зь вёсак. Між іншым, калі звярнуцца да напояў... Судзячы па бутэльках, самагон ці «наркомаўскія» 250 і паўлітра былі ня вельмі пачэснымі напоямі для працоўных. Нядрэнна, судзячы па сьметніцах, ішло нямецкае піва, шампанскае, віны, такія як танная нямецкая барматуха з франтавога пайка, ці дарагія, фірмовыя, у бутэльках з прыгожымі рэльефнымі малюнкамі, «Рыскі бальзам», прыцягнуты немцамі з Францыі лікёрчык зь зялёных чатырохгранных бутэлек. Партызаны, праўда, не падзялялі нямецкую прагу да касмэтыкі: розных крэмаў, ласьёнаў, мэдычных шмаравідлаў. Добрым попытам апроч ленд-лізаўскіх карысталіся і нямецкія кансэрвы, а таксама мяккі сыр тыльзыцер для бутэрбродаў, у тубах, накшталт зубной пасты. Аднак дзяля ісьціны трэба дадаць, што лёгка і дужа ве-

села ім там наўрад ці жылося. Немцы і карнікі патрабавалі забаваў ня меней, чым у «шчасьліўцаў», сьляды якіх таксама засталіся ў зямлі. Большасьць жытловых зямлянак маюць моцныя сьляды пажараў, іншы раз па рэчах зь іх бачна нейкая прага цягнуць усё, менавіта каб выжыць. Запомніўся выпадак, як у адной з такіх мы натрапілі на абутак з чырвоных (ці не са славутай харутвы?) анучаў і аўтамабільных пакрышак.

У такія моманты разумееш, што напраўду ёсьць зямля і сапраўдныя скарбы, якія яна захоўвае: толькі там маецца інфармацыя, праўдзівая на 100 адсоткаў. Тыя ж успаміны, а тым болей разважаньні нейкіх людзей, могуць быць праўдай на 80, 99, ці колькі там яшчэ тых адсоткаў, па аб'ектыўных прычынах. Чалавечы фактар працуе бяз збояў.

Прыкладам, шмат хто чуў такую фразу: «Археолягі па крупінках аднаўляюць мінулае». Прывяду прыклад. Пры раскопваньні кулямётнай ячэйкі мною знойдзена N-ная колькасьць страляных стальных нямецкіх гільзаў калібрам 7,92 мм. Па форме выемкі ад ударніка можна сказаць, зь якой зброі вялася стральба. Па боку, на які яны выкідаліся, можна сказаць, у які бок цэліў кулямётчык. Па мэтале і даце вырабу набою можна прасачыць, не раней якога году адбывалася тая страляніна. Гэта ўсё дакладна вядомыя, стопудовыя, як кажуць, факты. Гэта мае тыя самыя 100 адсоткаў ведаў аб вайне. Сьмешна?

Каму як. Але тое і ёсьць тыя самыя крупінкі, і колькасьць тут не галоўнае. Там ужо на 80 можна паразважаць, хто сядзеў у тым акопе: немец, які абараняўся, чырвонаармеец з трафейнай зброяй, які трапіў у атачэньне, ці пасьляваенныя хлопцы знайшлі цацку, па кім ці чым гасіў той стралок...

Калі на вёсцы распавядалі аб партызанах, то яны звычайна стаялі на адной дошцы з эсэсаўцамі альбо карнікамі, якія ў асноўным складаліся з казакаў, «камінцаў» і ім падобных. Саміх немцаў ня дужа баяліся, а да некаторых асобных нават ставіліся прыхільна, успамінаючы нейкія выпадкі па сёньня. Прыкладам, гарбату ці какаву ў дзяцінстве я піў з кубачка тоўстай парцаляны, з адбітым тронкам, падаючы які бабуля заўсёды дадавала: «А з гэтай кружкі піў нямецкі афіцэр...»

## «ГАРЫШЧА»

У апавяданьні я надаю асноўную ўвагу такому віду пошуку, як раскопкі, але сярод рознага кшталту пошукавікаў існуе яшчэ і так званае «гарышча». Са старых, даваенных ці дарэвалюцыйных хат дасюль выцягваюць розныя жбанкі, рушнікі, прасьніцы і да таго падобныя рэчы. Зацікаўленасьць у такіх пошуках прысутнічае сярод этнографаў.

Адносіны да такога захапленьня ці працы ў большасьці, зь кім мне даводзілася размаўляць, вар'іруюцца ад стрымана-халодных да негатыўных, нават іншы раз у размовах усплывае азначэньне «марадзёрства». Асабіста я ня бачу ў «гарышчы» нічога амаральнага. Гэтыя рэчы не былі згубленыя ці скрадзеныя — яны пакінутыя самімі гаспадарамі. Дапускаю думку, што, даведайся яны аб другім жыцьці таго, што калісь было забыта, што не было магчымасьці вывезьці, што ім самім было не патрэбна, яны былі б збольшага задаволеныя.

Разумеючы навуковую каштоўнасьць такіх прац, я ня вельмі прыхільна стаўлюся да раскопак навукоўцамі (пра марадзёраў ня буду ўжо і згадваць) старажытных могільнікаў, асабліва курганных. Мне заўсёды ўяўляюцца сучасныя могілкі, асабліва на Радуніцу, пры ўзгадваньні аб дасьледаваньнях курганоў. Уяўляю, як раскопваюць і распранаюць

сваю бабку ў нейкім калене. Тое, што мы ня памятаем аб прашчурах, якія таксама ляжаць у іх, часам, бывае, і побач з сучаснымі магіламі, канешне, гонару не дадае. Але тое асабістае меркаваньне, тэма даволі балючая і складаная.

# ГІСТАРЫЧНЫЯ КАШТОЎНАСЬЦІ

Сам я, аднак, ніколі не кранаў ніякіх гістарычных ці археалягічных помнікаў. Прычына не ў законапаслухмянасьці — закон што дышаль. З маім стаўленьнем да «копу» мне, па-першае, хапала самастойна знойдзеных месцаў, якія распрацоўваў толькі я, а ня нехта там, рвучы яго на паловы — палова ў дацэнта з універа, палова ў мяне пад ложкам... Не цікава! Па-другое, я вельмі добра засвоіў жыцьцёвы закон — абыходзься зь іншымі так, як хочаш, каб абыходзіліся з табой. Гарадзішчы, розныя селішчы — хлеб тых, хто іх выявіў, мне ня вельмі даспадобы, каб нехта разяваў рот на мой кавалак. А па-трэцяе, ёсьць такая істотная рэч, пра якую забылася большасьць капальнікаў, што жывуць у сацыяльна арыентаванай дзяржаве, як калектыўная адказнасьць. Апошнім часам, праўда, нейкія кволыя галасы нарэшце пачалі прабівацца.

Мне чамусьці ўзгадаўся Полацак, зь яго месцамі ў рэчышчах, за якія я хваляваўся і таму з фанатызмам зачышчаў зь сябрам рачное дно «пад нулі». Зь цягам часу і са зменай прыярытэтаў тое знікла, і перамога над жудасным зьверам-душыцелем — жабай — была вялікай палёгкай. Цікава, што на буйных рэках вельмі рэдка шанцавала на

нейкія ўзорныя знаходкі — там усё была нейкая, хоць і каштоўная ў гістарычным пляне, дробязь, якая распавядала збольшага пра час засяленьня пасадаў, гандлёвыя сувязі, сацыяльны статус жыхароў, але сапраўдны гонар калекцыі паходзіў з малых рэк ці іх берагоў.

Прыярытэтна каштоўнымі для мяне зьяўляюцца старажытныя рэчы, асабліва крывіцкія ці балцкія па паходжаньні, па часе. Амулеты, фібулы, якія так захаплялі на стэндах музэяў у дзяцінстве, пярсьцёнкі...

Што найбольш захапляе ў іх, дык гэта ручны выраб, які робіць іх жывымі, рэчамі з душой, як кажуць. Між іншым, яшчэ адна з прычын, па якой я аддаю перавагу гістарычнай каштоўнасьці перад «хабарнай», ці матэрыяльнай, — на знаходкі глядзіш зусім па-іншаму, калі выцягнуў іх зь зямлі сам і ведаеш, адкуль яны, чым яны ёсьць. Прыкладам, нож з раскапанага жытла на паселішчы — гаспадарчы інструмэнт, а такі ж нож з кургана, знойдзены на разараным полі — амулет-абярог. Каменная сякера са стаянкі бронзавага веку — проста сякера для апрацоўкі дрэва, а знойдзеныя ў пластах XIV–XVII стагодзьдзяў на Верхнім замку Полацку — абярогі ад хлеўнікаў, каб не заяжджалі жывёлу па начах. Тыя ж барацінкі з палёў не заўсёды можна лічыць манэтамі, грошамі ў сэньсе. Некаторыя кідалі наўмысна, на ахвяру для выкліканьня дажджу ці на добры ўраджай, такія «падарункі» па-наву-

коваму завуцца вотамі. Рэч самастойна адкапаная, са сваёй гісторыяй у дадатак ператвараецца ў частку гісторыі тваёй, асабістай.

Падчас міжсэзоньня, ці так, увечары, часьцяком даводзіцца бавіць гадзіны ў іх сузіраньні, і ў такія моманты праз кожны завіток на ўпрыгожаньні, «калачык» на крэсіве, кожны штампік салярнага ці зігзагападобнага арнамэнту, зроблены нечай рукой, пачынае зацягваць у сябе — ня тое каб у свой час, эпоху, культуру ці падобнае... Цяжка растлумачыць. Дадаюць сваё ўспаміны і адчуваньні ад месца знаходкі. Іншы раз, хоць і рэдка, месца выяўленьня прадмета дапамагае прасачыць, як рознымі майстрамі дасягалася майстэрства і вопыт у вырабе аднолькавых рэчаў ці, асабліва на сельскіх паселішчах, як майстар зь цягам часу набіваў руку на ліцьці аднолькавых падвесак у адной і той жа, вытачанай ім самім ліцейнай форме. Менавіта па згаданых прычынах у большасьці капальнікаў гонар калекцыі, самыя каштоўныя знаходкі — выцягнутыя зь зямлі самастойна, а не вымененыя ці выкупленыя бог ведае адкуль. Таму трэба прызнаць, камрады, сьмейцеся — ня сьмейцеся, а гісторыя для вас ёсьць таксама калі не галоўным, дык важкім фактарам перад звычайным хабарахапаньнем. Цікава, тут як заўсёды спрацавалі прабітыя і аднооўленыя праз «тоўстую скуру» адчуваньні, і апошнім часам яны становяцца ўсё істотней.

Веды аб часе і сучасьніках, якія перадаюцца з тымі рэчамі, з наведаных або з добра знаёмых родных месцаў, ізноў, як у дзяцінстве, пачынаюць дадаваць іншыя веды, што нельга выразіць словамі ці думкамі.

Акрэсьліўшыся з больш гістарычнай, чым калекцыянэрска-капальніцкая, формай захапленьня, я пачаў разумець, што адцягненьне зь берагоў полацкіх рэк на палі і лясы было недарэмным. Калі горад дае адказы на такія пытаньні, з боку якіх культур існаваў уплыў на яго жыхароў, зь кім мы гандлявалі, ваявалі, пра дзяржаўны і палітычны лад і яго фармаваньне, быт заможных асобаў, то вёска давала адказы на тое, кім ёсьць большая частка нашага народу па культуры, звычаях, паходжаньні. Па той прычыне пры пераважнай колькасьці раскапанай і дасьледаванай плошчы гарадоў мы мяркуем чамусьці пра гісторыю ўсяго народа. Іншы раз перавага некаторых знаходак ці вылучэньне і акцэнты на іх дае падставу называць Полацак, а разам зь ім і прылеглыя землі «исконни славянскими». З такім жа посьпехам можна зрабіць любы беларускі горад часткаю Кіеўскай Русі, Арабскага халіфата ці Лівонскага ордэна.

Апошнім часам сталі кідацца ў вочы і адштурхоўваць адносіны гісторыкаў да дзяржаўных утварэньняў, жыцьця ў іх, асабліва ў ВКЛ. Я, не палохаючыся, магу сказаць, што яны нясуць у сабе нейкае адценьне раб-

скасьці. Пры разгляданьні такіх момантаў усё часьцей чуюцца нейкія апраўдальныя фразы кшталту «а ў нас, як і ў краіне N...», «а ў нас рабілі ня горш, чым у...». Гісторыя вясковага насельніцтва, з усімі яе недасканаласьцямі і дасягненьнямі, нягледзячы на цудоўную зброю, перавагу ў тактыцы вайсковай справы і земляробстве суседзяў, застаецца часткай пакінутага менавіта сваімі далёкімі прашчурамі, таму і здаецца болей цікавай.

* * *

Каб не рамантызаваць, заўважу, што ўсё ж шмат калегаў прыйшлі ў справу дзяля карысьці. Штуршком для папаўненьня шэрагаў капальнікаў сталася даступнасьць тэхнічных сродкаў для пошукаў, што замяніла зацікаўленасьць, энтузіазм, выпрабаваньні на шляху пошукавіка. Гэтыя фактары сталі адной з прычынаў усталяваньня ў навасьпечаных колах прыярытэтаў: лягчэй проста бессэнсоўна калупаць зямлю дзяля прыгожых фантыкаў, чым напраўду спрабаваць аб нечым даведацца. Але ж гэтая хоць і колькасная большасьць ня дужа і робіць сапраўднае надвор'е ў асяродзьдзі; аднак яна пераважна й асацыюецца апошнім часам у большасьці пабочных людзей з капальнікамі. Ды калупаньне зь цягам часу надакучвае... Пра тое крыху далей.

Мне чарговы раз узгадаліся мае паплечнікі, зь якімі я першыя разы выяжджаў «па

вайне». Наша абсталяваньне? Зонд з арматуры, «Атлас Витебской области», што быў прыдатны толькі для распалу вогнішча, старыя джынсы, школьны пляцак, падручнікі ў якім пасьля мелі пах хвоі, зямлі і вогнішча, і сапраўднае шчасьце — сапёрная рыдлёўка.

Тоны зямлі я з напарнікамі прапускаў праз сіта на берагах полацкіх рэк. З гэтымі людзьмі зь цягам часу скláліся розныя адносіны, але павага да іх чым далей ад тых падзеяў — тым болей. Гэта людзі, якія акрамя выпрабаваньняў змаглі ў розным ракурсе зірнуць на сваё захапленьне, зрабіць яго сваім ладам жыцьця. Толькі па іх, здавалася б, немагчымых дзеяньнях на прыродзе — ня зьмерзнуць падчас начоўкі на 20-градусным марозе, разьвесьці кастрышча на вадзе — можна ўпэўнена сказаць, што яны не капітулююць і пад іншымі, сацыяльнымі, жыцьцёвымі, якімі там яшчэ абставінамі. Цікава параўнаць іх, упэўненых у сваім з годнасьцю пройдзеным шляху, і «капальнікаў новай фармацыі», якія дрыжаць пры кожным узгадваньні аб нейкіх указах, пастановах... Залежнасьць, панове, залежнасьць — адна з найвялікшых кволасьцяў, яна ёсьць грунтоўным складнікам, неабходным для існаваньня соцыюму, калі вяртацца да напісанага...

Чаму тады, нягледзячы на надакучлівасьць ад зьбіраньня цукерачных абгортак, на розныя пастановы «зьверху», так званае новае пакаленьне не сыходзіць са сцэны? Адказ

ужо гучаў — веды. Але тут ёсьць яшчэ адна складанасьць. Сёньняшняя гісторыя, асабліва цягам некалькіх апошніх стагодзьдзяў, падзялілася на гісторыю-навуку і гісторыю-прапаганду. Сёньняшняя гісторыя пісалася збольшага рознымі Гэбэльсамі, Карамзінымі, Гітлерамі, Тацішчавымі і Сталінымі, яна і ўспрымаецца большасьцю, зьяўляецца самай дасяжнай. Факты нават пра апошнюю вайну, што памятаюць яшчэ некаторыя сваякі капальнікаў, і прапаганда рэзка кантрастуюць між сабой і, вядома, выклікаюць прагу да пошукаў сапраўднасьці.

Становішча значнай колькасьці «маладых» мажліва параўнаць з агоніяй цяжка хворага: жадаючы ведаць праўду аб зямлі пад нагамі, аб сваяках, яны ня маюць патрэбных інструмэнтаў, нейкіх дапаможных фактараў для вывучэньня жаданага, таму часьцяком хапаюць усё, разам, прагна. «Абгорткі», пра якія ёсьць інфармацыя на інтэрнэт-форумах, у навукова-папулярнай літаратуры ці ў падказаных знаёмых; нешматлікія кнігі сапраўдных гісторыкаў, напрыклад Леаніда Побаля, Людмілы Дучыц, Георгія Штыхава ці Вадзіма Шадыры, зь якіх тая інфармацыя з-за прагі іншы раз выхопліваецца кавалкамі, фрагмэнтамі. Так, распаўсюджаная апошнім часам альтэрнатыўная гісторыя і гістарычныя байкі — адзін з вынікаў імкненьня «хворага да лекаў», альбо вынік ад «навучаньня вызваліцеляў» аб «истинных арийцах» ды «исконни славянушках».

Не скажу аднак, што «стары прызыў» — спрэс непрызнаныя гісторыкі, археолягі, тым ня меней калегі ці канкурэнты, яны пры сваіх назапашаных якасьцях — нейкі ўзор дасканаласьці. Менавіта ім, зь іх «нюхам», даводзіцца без рэклямы, без пантоў знаходзіць і дэтальна «выносіць» невядомыя па ўспамінах бліндажныя гарадкі, яны здольныя толькі ад аднаго «пачуцьця старажытнасьці» без гугл-мэпсаў і GPS-нікаў знайсьці ў самым неверагодным месцы паселішча балцкай эпохі ці часоў ВКЛ. Для таго каб «моладзь» зразумела, што я хачу давесьці пра іх тэхнічныя перавагі, парушу дадзенае ў прадмове слова і працытую пісьменьніка Паўла Каэльля: «Яны шукаюць скарбы, спрабуючы абысьці шлях да іх». Са сваёй званіцы дадам, што адносіны да пошуку як да рыбалкі ці паляваньня не зусім адпавядаюць рэчаіснасьці. Рыба пойдзе на нераст, жывёлы расплодзяцца, а старажытныя рэчы, што вельмі шкада, такіх магчымасьцяў ня маюць. Інфармацыя аб іх тым болей.

Асабіста мяне зачапіла і ўменьне людзей, чыё захапленьне звязанае з гісторыяй, асноўнай якасьцю якіх павінна быць здольнасьць да назіраньня і запамінаньня, ня памятаць нават тых падзеяў, што адбыліся на іх вачох. Як большасьць навасьпечаных калегаў на розныя прапагандысцкія выпады ці «прышыбленыя законы» апраўдваюцца словамі: «Што я такога раблю?», — нібыта

не жылі ў савецкія часы і ня ведаюць словаў «негласно не одобряется». А агулам вынік — галоўным ёсьць вашая ўпартасьць, рукі-ногі і мазгі. Калі тое ёсьць — усё атрымаецца і замацуецца.

Выпрабаваньні, блізкасьць да прыроды робяць шлях да сапраўднай волі лягчэйшым для капальніка, хоць некаторымі звычайныя перашкоды ў справе падаюцца іспытам на трываласьць. Ад маладзёнаў іншы раз вылазяць у сеціва ролікі з «гераічнымі» фарсіраваньнямі раскіслых дарог, пошукаў пад залевай і да таго падобнае. Тут усё зразумела — хтосьці загартуецца, кагосьці, нарэшце, адкіне натуральны адбор, а нехта прыстасуецца пад зручныя для сябе абставіны. Асабіста мне куды цікавей і складаней уяўляецца шлях да свабоды чалавека з гарадзкога соцыюму, які ў даважак дасягнуў яго без разбурэньня свайго асяродку, нейкімі альтэрнатыўнымі сродкамі і мэтадамі.

Адным з галоўных дзяржаўных інструмэнтаў кіраваньня натоўпам заўсёды была прапаганда. У выпадку з капальнікамі яна таксама мае вялікае значэньне, напрыклад, як каталізатар для зьяўленьня новых людзей у абмяркоўваемых колах ці іх зносінаў са зьнешнім сьветам, але што тычыцца вынікаў яе прымяненьня, то тут сапраўды атрымліваецца найдзіўнейшая куламеса, бо на розныя слаі насельніцтва, на людзей з рознымі асабістымі якасцямі ды пры розных абста-

вінах яна ўплывае на першы погляд непрадказальна.

Ваеншчыкаў у прапагандысцкіх дакумэнтальных фільмах ці перадачах часьцей за ўсё малююць звычайнымі марадзёрамі. Уся гэтая каляровая балбатня нібыта павінна адпужваць, выклікаць агіду ад убачанага. Але ці паказваюць там пакалечаныя целы тых, хто падарваўся на боепрыпасах, ці іх рэшткі, разьвешаныя па гальлі? Лёсы і цяжкасьці тых, хто атрымаў турэмныя тэрміны? Наўрад ці. Звычайная структура такой перадачы — усё, што трэба здароваму мужыку. Тут рызыка — падрыў на боепрыпасах, цяжкасьці выжываньня на прыродзе. Тут канспірацыя, сапраўдная гульня і казытаньне нэрваў — спэцслужбы. Тут здабыча — грозныя і прыгожыя на выгляд ваенныя рэгаліі ды зброя. Што дзяржавам постсавецкай прасторы карысна стварэньне такіх фільмаў — не выклікае сумненьня, хаця б з той прычыны, што праваахоўныя органы складаюць таксама людзі і зарабляць ім патрэбна ня меней, чым астатнім. Іншы раз гэтыя гульні нагадваюць мне сытуацыю з нашымі лекарамі, якія ведаюць, як лячыць нейкую хваробу, але ня маюць права пра тое казаць, бо іх заробак залежыць ад выпісанага рэцэпту. Таму, каб падштурхнуць пацыента, яны пачынаюць іншы раз неяк нават груба пхаць яго да самастойных пошукаў вырашэньня праблемы. Нібыта дзяржава сама падказвае нам,

як здабываць веды, свабоду, і нават дае ад сябе падрабязны прайс на дадзеныя паслугі. За індывідуумам застаецца права выбару і трываласьці пры сплаце коштаў.

На прыкладзе старыны ці поля прывяду негатыўныя наступствы зьявы. Такая вось сытуацыя... Нейкі са згаданых гісторыкаў-кар'ерыстаў (а менавіта яны часьцей за ўсё займаюцца гэтым) піша для галоўнай дзяржаўнай газэты вялікі артыкул аб тым, колькі каштоўных старажытнасьцяў «чорныя капальнікі» дастаюць зь зямлі і як яны шыкоўна з гэтага жывуць.

У той жа час у заможнага чыноўніка з сувязямі ў сям'і вялікае гора: яго дзіця, на якое ён ускладаў столькі надзей, якое, канешне, самае таленавітае і разумнае, падыходзячы да трэцяга дзясятку, нечакана перасялілася ў комп з усімі наступствамі. Авохці горачка! І тут, як прамень зь неба, жонка чыноўніка дастае з паштовай скрыні паратунак у выглядзе той самай газэты з артыкулам геніяльнага «прахвесара», і з жаночай «чуйкай» на свой лад бачыць паратунак для дзіцяткі ў мудрых словах прамоўцы.

— Мікола, я паглядзела ў нэце, гэты мэталюшнік каштуе ўсяго 350 баксаў. Ты на паляну ў нядзелю па 500 убухваеш. Падумай аб сыне.

— Дык не праблема, на...

— Ну глядзі, ён тут піша, яны і зарабляюць на гэтым нядрэнна...

Апошняя фраза нарэшце пераконвае непаслухмянае дзіцятка выйсці ў поле. Але да першай нейкай там латуннай фіговіны, спражкі ці чаго... Ён дакладна ведае — на базары стаіць мужык, які такое скупляе...

Пасьля заявы мужыка з базару, што яму такое не патрэбна нават задарма, спражачка ляціць у сьметніцу, новы мэталюшнік сыходзіць на гэты раз ужо на незваротнае існаваньне разам з гаспадаром у лябірынты сусьветнага сеціва (быў час, калі такая зьява панавала на розных інтэрнэт-форумах; шмат хлопцаў бралі прыборы з завадскім пахам па напалову меншых коштах), а спадар N з гістфаку нейкага паважанага інстытуту губляе з археалягічнага помніка, не пазначанага хаця б кардоннай шыльдачкай, тую крупінку доказаў, якой яму не хапала для таго, каб давесьці апанентам аб пражываньні на селішчы выхадцаў зь нейкіх там плямёнаў у пэўны час, то бок для праўдзівай працы гісторыка. Так, ёсьць гісторыя-навука, а ёсьць гісторыя-прапаганда, і, як бачым, яны не зусім сыходзяцца ў адзінае цэлае.

Зьвярнуся да цяжкасьцяў ці наступстваў справы, зь якіх абывацелю самымі яскравымі пададуцца працоўна-сямейнае становішча і здароўе. Ну, калі вас замялі органы, то гэта назаўсёды. І, паўтару, ад дзяржаўнага ладу гэта не залежыць. Рыхтуйцеся, што, згодна з нормамі таварыша фон Клаўзевіца, біць будуць у самае сэрца. Пры патрэбных выпад-

ках інструмэнтамі ўзьдзеяньня будуць акурат ваша праца і сям'я. Аднак фанатыкі з тых, каго я заву сапраўднымі, часьцей за ўсё з-за ўпору на справу і дакладнага веданьня, чаго ён напраўду хоча, не абзаводзяцца сем'ямі, а страта працы ў параўнаньні з перажытымі выпрабаваньнямі ня ўспрымецца як нейкая асабістая праблема.

Так, да слова, прафесійныя хваробы капальнікаў збольшага носяць прастудны характар: застуджаныя суставы, прастрэлы, «мужчынскія» хваробы таксама сталіся звыклымі сярод «зьвіхнутых на хабары». Дуркуватых вось успомніў, дакладней!.. Ня ёсьць рэдкімі і траўмы кшталту пераломаў ці моцных парэзаў, ад працы сякерай у цёмным лесе, напрыклад.

У некаторых чытачоў можа ўзьнікнуць пытаньне: «Ніколі не хацелася адпачыць, заняцца нечым іншым?» Што да іншасьці, то не асабліва. Ёсьць, канешне, тло — справы, якія таксама выклікаюць немалую цікавасьць, як, прыкладам, літаратура, музыка, а яшчэ вельмі хацелася б паспрабаваць сябе ў якасьці кухара. Зацыкленасьці на справе няма, ёсьць прыярытэты, таму стараюся разьвівацца, не стаяць на месцы ў сваім захапленьні, шукаць іншыя формы яго рэалізацыі, напрыклад, узяўся вось нечакана для самога сябе кнігу пісаць. («Звар'яцеў ці што?» — іншы раз сам у сябе пытаюся.)

Праўда, быў неяк настрой кінуць блуканьні «па вайне». Адбылося тое, калі пачалі зьмяняцца формы майго захапленьня — з хабарнай да гістарычнай, калі хацелася ўлезьці ў сутнасьць справы. Падчас міжсэзоньня, праглядаючы нейкія кінахронікі, дакумэнтальныя фільмы пра баявыя дзеяньні і меркаваньні аб падзеях тых часоў, аб палітычным становішчы ў сьвеце, я пачаў разумець, што выраз «палітыка — брудная справа» не зусім дакладны. Дакладней — палітыка і ёсьць брудам. Узгадаць хаця б таго ж фон Клаўзевіца, галоўная праца якога «Аб вайне» паказвае вайну як адну з формаў палітыкі, як працяг яе.

Тут узгадваецца Расоншчына, зь яе прыгожымі маляўнічымі бярозавымі гаямі, палянкамі паміж імі і адзінкавымі соснамі. Па вясьне!.. Але калі пачынаеш чарговы раз высьвятляць нешта ў мясцовых, табе раптам распавядаюць, што тая паляна — вялізная магіла, закіданая пластамі невядома кім і нашто забітых людзей — дзяцей, старых, жанчын... Мяне накіраваў у аўт адказ аднов бабулі на пытаньне, хто і нашто мог там страляць тых людзей: «Можа, проста так... Вайна ж была». Мы потым ізноў праходзілі праз тую залітую сьвятлом паляну, цяжка, канешне, сказаць нешта так вось, словамі, але такіх месцаў там, па аповедах калег, мясцовых, ды нават навапалачан, пераехаўшых адтуль ужо некалькі дзесяцігодзьдзяў таму, хапае.

Ня так даўно выцягнулі з-пад сукна справу Леха Валенсы, высьветліўшы, што ён нібыта зьяўляўся сэксотам. Якая бура ўзнялася! Праўда, у эмаляваным тазку. Валенса пайшоў у асяродзьдзе, дзе адна з самых часта ўжываных формаў дзеяньня — забіваць «проста так». А мо яшчэ ўзгадаць пра маштабы той дзейнасьці, ахвяры якой роўныя яе памерам і коштам? Прайс на капальніцтва, выстаўлены дзяржавай, трэба думаць, ужо здаецца цяжкім, мала хто на тыя кошты пагодзіцца. А тут што? Мы ўжо судзьдзі вышэйшай інстанцыі?

Хаця апошнім часам палітыкі, як і гісторыкі, болей кіпішуюць на выгляд, на прапаганду, праўда, у памерах даволі дробных. Яскравы прыклад, як мы асуджаем рускіх зь іх «победобесием» і няўмеласьцю вынесьці з Другой сусьветнай нейкі досьвед.

Пра Грунвальдскую бітву чаго толькі не напісана! Колькі было баявых харугваў, адкуль, колькі сьцягоў, тактыка і стратэгія, чаго нахапалі ў трафеі і ў палон... Узгадваецца знакамітая фраза: «Можна выіграць бітву, але прайграць вайну». Такое ўражаньне ад гэтай інфы, нібыта вайну мы здулі, выйграўшы адну тую бітву. Ніякіх карэнных высноваў у працах на гэтую тэму чамусьці няма. Проста абараніліся ад фізычнага вынішчэньня? Толькі колькасьць войска і адзіны манэўр Вітаўта з адыходамі дапамаглі разьбіць адну з мацнейшых ваенных і палітычных

груповак таго часу? Аналягічныя ваенныя задачы вырашалі яшчэ ў жалезным веку абаронцы гарадзішчаў і навакольных селішчаў. Такім чынам, атрымліваецца, сёньня пра тую бітву можна і забыць, калі такога было, нават і пасур'ёзьней.

Так, манэўр Вітаўта дапамог у перамозе каля Дуброўны. Але вырашальны манэўр быў зроблены яшчэ да сутыкненьня паміж закаванымі ў латы вершнікамі.

Вядомая барацьба паміж Кейстутам і Ягайлам, падчас якой малы Кейстутавіч вучыўся сядаць на каня, трымаць меч, абаронены ад кожнай кроплі дажджу, — усё гэта дзякуючы тым самым рыцарам, на якіх ён той меч і падыме. Але княжыч Кейстутавіч, бацькамі якога, без прымяншэньня, можна лічыць тэўтонаў, зрабіў выбар на карысьць вялікага князя літоўскага, пад рукой якога была зямля і мільёны людзей, што верылі яму і разьлічвалі на яго, вялікага князя.

Сучасным палітыкам не хапае, а іншым разам здаецца, што цалкам адсутнічае ў іх асяродку такая якасьць, як выразны выбар праграмы і палітычнага шляху і — падкрэслю — уменьне ісьці па ім разам з гэтым выбарам. Гісторыкам, падобна, бракуе здольнасьці аналізаваць падзеі і рабіць патрэбны акцэнт у палітычных справах. Па вышэйшым прыкладзе тое добра бачна, аднак сапраўднасьць часьцей выліваецца ў выглядзе «Валенсы-здрадніка». Эмаль на тазку парэпалася...

Прабачце, крыху адхіліўся ад тэмы. Дык вось гэты палітычны складнік вельмі адхінаў ад «копу», ад сутнасьці таго, што я шукаў у тым лесе. Але трэба было вярнуцца ў тую глухмень, як вясеньняя прырода, стары знаёмы лес паварочвалі на іншыя думкі: што ўсе тыя рэчы згублены звычайнымі людзьмі, якія трапілі сюды па-розных прычынах, што на мёртвых выпомшчваць нянавісьць — апошняя справа, што, як ні круці, а падзеі тыя адбываліся на нашай зямлі, хто б іх сюды ні прынёс — яны частка гісторыі гэтай зямлі. Зразумела, адчуваньні ад знаходак — профіль гансаўскага каўпака, навешанага на рыдлёўку, лічбы і клеймы, што вылазяць з-пад глінянага бруду на амуніцыі, ці нейкі абцайхен, што коціцца па зямлі адвалу зь ямкі... «Стойбішча» партызанаў, «народных мсьціўцаў з навакольных вёсак», вось яшчэ...

Разьліковы квіток ад дзяржавы я ўсё ж атрымаў. Абставіны разьліку, выбачайце, фінансавая таямніца. Насамрэч яго атрыманьне збольшага рамантызаванае, бо разьлік — чыста карысная і не такая ўжо прыгожая ці прыемная справа. І, сплаціўшы «пазыку перад Вялікай Дзяржавай», сам сабе зьдзіўляюся: я замест крыўды і скісаньня ад шкадаваньня сябе пачаў высьвятляць, якія барышы з гэтага маю я. Напачатку ўсё адбывалася спантанна — яшчэ ня «ўехаў», не асэнсаваў, што адбываецца. Дый наступствы не давалі чакаць праяваў. Аднак, пасварыўшыся з

напарнікамі, якіх я асабіста лічыў прычынай свайго не зусім мяккага «знаёмства з падатказьбіральнікамі», я застаўся сам-насам.

Першае пытаньне, якое я асэнсавана задаў сваёй разьдзьмутай асобе: «Калі лічыць, што гэтыя людзі — прычына маіх няўдач, то з каго спытацца, як яны трапілі ў тое асяродзьдзе і трымаліся там?»

Канешне, каб стварыць сабе хоць нейкую бясьпеку, некаторыя пачынаюць вывучаць, назіраць за мэтадамі працы рознага кшталту ворганаў, неяк шыфравацца. Асабісты вопыт з фразы «на рыдлёўцы ўсе сыдуцца» вучыў, што ня трэба глядзець на археолягаў ці капальнікаў, марадзёраў ці кар'ерыстаў. Калі мы ўжо так любім падзяляць і сартаваць на нейкія кучкі, групы, слаі, то бліжэй тут будзе дзяліць на людзей адэкватных і ня вельмі. Касякі, што робяцца іншы раз прадстаўнікамі розных бакоў пры навучаньні ці атрыманьні вопыту пры нейкіх абставінах і характарах людзей, таксама ня служаць канчатковымі крытэрыямі асобаў. Карацей, як па мне, дык трэба проста прыглядацца да кожнага зь людзей, зь якімі сутыкаешся. З апошняга я і пачаў.

У чым моц людзей, якія зараз кіруюць краінай? У іх ёсьць выразная мэта — улада. Яны ня ставілі пытаньняў: колькі, як, чым скончыцца? Трэба прызнаць, тут яны зараз выйграюць. І тыя, хто побач зь імі, таксама. Па вельмі простай, банальнай прычыне

працаўнікі ворганаў маюць перавагу над большасьцю незадаволенага грамадства — яны ведаюць цяжкасьці бытавухі, агульнага становішча і пры ўсім веданьні цьвёрда вырашаюць, што іх шлях будзе вось такім; лад у дзяржаве ім спрыяе, і яны асабіста здольныя зрабіць крок да яе. Іх грахі, няпраўды, памылкі — таксама іх выбар, і ў прыняцьці гэтага таксама іх моц. Пры кволасьці такіх колаў, як апазыцыя, інтэлігенцыя, ды сярод капальнікаў таксама хапае індывідуумаў з такімі якасьцямі, якія калупаюцца ў чужых грашках... Гэта ня шлях моцнага чалавека, а хутчэй нават судзеяньне, патураньне, асабліва калі ўлічыць іх стартавыя магчымасьці і апору, якая ў іх ёсьць. Так ці інакш, добра ці дрэнна, але абодва бакі завязаныя на чым? Так, на прыграшэньнях ворганаў ці ўлады.

Выбар шляху кожнага чалавека — выключна яго справа. Таму, нягледзячы на нязгоду і канфлікты, я з павагай стаўлюся да ўсіх людзей, якія цьвёрда вызначыліся са сваім шляхам. Тое, што хтосьці ня можа абараніцца ад супернікаў, пераўпэўніць сваімі перакананьнямі, згуртавацца ці дзейнічаць у адзіноце, прыняць ці зразумець нейкія дзеяньні — праблема тых асобаў. Сутыкненьні зь людзьмі зь сілавікоў паказалі мне, што такое сапраўдная сіла і ўлада ў тых, хто вызначыўся з самім сабой тут і зараз, чаго сіла і воля будуць каштаваць мне і як трымацца з агульным навакольлем на роўных.

Падбіўшы свае барышы ад прыгодаў з разьлікамі, я адначасова вырашыў праблему з залежнасьцю ад пабочнага кантролю. Праведзеныя ў цяжкіх умовах часы далі магчымасьць замацаваць разуменьне — толькі ты сам можаш даць сабе свабоду; індывідуум зь лесу раз-пораз вяртаецца ў соцыюм і карыстаецца яго паслугамі, таму трэба ўмець трымаць сябе і ў ім.

Заганная якасьць нашых інтэлігентаў і апазыцыянэраў — ісьці крывым шляхам, як капальнікі, што лічаць наваройчаны прыбор і рыдлёўку залогам посьпеху. У сеціве даводзіцца чытаць, што сярод міліцыянтаў шмат, калі ня большасьць, недалёкіх, слабаадукаваных людзей. Цікавыя і мэтады барацьбы з гэтай зьявай — выйсці на вуліцы са сьцягамі, то бок даць міліцыянтам міліцэйскую працу. Адны працуюць са сьцягамі, іншыя — з дубінкамі. Гэта, зразумела, лягчэй, чым напраўду адчуць слабіну ў рэжыме, з элегантнай лёгкасьцю і ўнутранай непахіснасьцю, як і належыць таму, хто дзейнічае розумам, прамінуўшы жывёльную, грубую сілу, знайсьці выйсьце на маладых хлопцаў, якія яшчэ ня сталі міліцыянтамі. Затое калі тыя нарэшце імі стануць, ганьбіць іх, што яны, маючы выбар для лёсаўтваральных умоў, не зьвярнулі ўвагі на славутых, якія чым займаліся?.. Падсумоўваючы, ня будзьма забывацца, чым ёсьць палітыка, і на розьніцу паміж ёй і творчасьцю, нейкімі гу-

маністычнымі альбо рэлігійнымі ідэаламі; ня будзьма забывацца, што людзі, якія атрымалі сілу, таксама нечым плацілі за яе — наіўна лічыць, што яны ня будуць ёю карыстацца.

Каб зразумець матывы слабасьці згаданых колаў і іншых, вярнуся да выпадку ў Варонецкім лесе, які паказаў мне марнасьць такой якасьці, як нерашучасьць. Вяртаючыся «з копаў» у цывілізацыю, у людзкі асяродак, я вельмі яскрава ўбачыў такую якасьць большасьці людзей, як адчуваньне сябе ахвярай. Без перабольшаньня, такая ступень нерашучасьці, безадказнасьці, пры ўмовах, аддаленых ад цывілізацыі, азначае пагібель. Яскравы прыклад — заблукалыя і потым знойдзеныя ратавальнікамі пэнсіянэры-грыбнікі, якія адпачывалі на прыродзе і зьбіліся з дарогі ды заблукалі.

Дзе шукаць яе карані? У хрысьціянскай традыцыі зваць сябе рабамі божымі? У соцыюме, дзе ўсё можна зваліць на суседа, калегаў па працы, на дзяржаву, урэшце, і пры гэтым пратрымацца за іх кошт?.. Пры ахвярнасьці, калі асоба нібыта ня можа дзейнічаць, калі магчыма зваліць усё на лёс, адкуль хто ведае, што выпадак, а што ўласнае дзеяньне? У ахвяры выпрабаваньні ператвараюцца ў праблемы, непралічаныя дзеяньні — у няшчасьці, гонар — у ярмо. Найбольш жудасна разумець, што ахвярнасьць спаралізоўвае нашую трываласьць, прагу да змаганьня. Ня рэдкасьць сярод невылечна хворых — за-

мест таго каб выкарыстоўваць апошнія часы жыцьця, мабыць, самыя каштоўныя, замест павагі да іх, замест барацьбы, не для выніку, а для той самай павагі, альбо садзяцца і пачынаюць рыдаць, альбо шалёна і з панікай шукаць пабочнага паратунку ў чым бы там ні было, толькі не ў сваёй волі і сілах. Я бачыў, як паміраюць жывёлы, і сказаць, што іх уласныя высілкі ў кананьні марныя, у мяне не атрымліваецца. Безумоўна, хоць раз у жыцьці нехта бачыў, як яны даюць неверагодны, здавалася б, вынік, у безвыходных сытуацыях. Неяк чуў пра распрацаваную на Захадзе псыхалягічную схему, што адлюстроўвае адчуваньні хворых на рак. Там ёсьць агрэсія, жах, прыняцьце... Ня памятаю дакладны парадак, пяць пунктаў, здаецца. Людзі, якія распрацавалі гэта, без сумненьня адкажуць, што паважаюць сваё жыцьцё.

Сам я ня так і шмат гутарыў з замежнікамі, каб сьцьвярджаць, на колькі ў іх разьвіты такі комплекс, але ў беларусаў, з нашай памяркоўнасьцю, ён ужо без усялякіх схем ладнавата зашкальвае. Згадваць усе прычыны, разважаць на гэты конт ужо не надта хочацца... Апошняй кропляй, што канчаткова замацавала становішча, стала несамастойнасьць, добраахвотная залежнасьць насельніцтва ў савецкія часы. Кватэру давала дзяржава, працу — дзяржава, усё даваў нейкі генсек, прэзідэнт, бацэнька... Беларусы — індывідуалісты, хутаране, мелі ўласны гонар, пакуль

мелі іншыя складнікі ўласнасьці — пабудаваную сваімі рукамі хату, працу на сваёй зямлі і зробленае на ёй, і шкадаваць сябе (хоць паплакацца з гора маглі) проста не было магчымасьці. Праз нейкія два-тры пакаленьні ў пошуках звычайнай самастойнасьці праўнук земляроба дзесяцігодзьдзямі ходзіць як сляпы па палёх і лясох з мэталюшнікам, каб для пачатку атрымаць хаця б больш-менш сапраўднае ўяўленьне аб такім разуменьні, як здабыцьцё хоць нейкай аддухі ў сьвеце спажываньня, бо перакладваньне ці пералічэньне скрынак з макаронамі, перагон чужой падкінутай нафты і выкід адходаў яе вытворчасьці на галаву сваім жа дзецям не даюць нават заробку — толькі падачкі, ня болей, што там пра астатняе казаць...

Вяртаючыся да пытаньня шляху асобы. Трэба сказаць, што пры ўсёй крытыцы большасьць нашай інтэлігенцыі, асабліва пісьменьнікі (па маім, мо і крыху аднабокім, разуменьні), усё ж ня так і збочваюць зь яго.

Як для мяне, найбольш выразным ёсьць шлях Васіля Быкава. Прымаў удзел у палітычным жыцьці? Так. Лез у палітыку? Не сказаць. Хутчэй змагаўся за сваю Радзіму — за гарматай ці побач з палітыкамі. Аднак жыў і ствараў на шляху празаіка, чым і перамог, зь нейкай паэтычнай элегантнасьцю і жыцьцёва-празаічнай цьвёрдасьцю, нават пасьля фізычнай сьмерці. З Быкавым-пісьменьнікам лічацца і ўлады, і рознага кшталту асобы.

Яго творы ў школьных падручніках, яго чыталі ці чытаюць, ведаюць міліцыянты, што ганяюць дубінкамі сьцяганосцаў на вуліцах. Толькі адзін ужо памерлы чалавек, які прайшоў свой шлях, вымушае іх іншы раз крытычна кінуць караценькі, пакутліва-балючы позірк на сябе. Сапраўдная памяць аб ім, падтрыманьне і падмацаваньне яго высілкаў сёньняшняй інтэлігенцыяй?..

...Ня ведаю дакладна, колькі яшчэ засталося мне йсьці сваім шляхам. Але што я вынес з пройдзенага? Мабыць, ідэалізуючы яго, яшчэ не завершаны, паспрабую адказаць, што сталася маім крэда, галоўным рухавіком да далейшага руху, вынікам пройдзенага адцінку. Што тут такога цікавага знайшлося з дапамогай мэталюшніка і рыдлёўкі.

Я йшоў па шашы вечарам. Калі я прыйшоў дахаты і мы з маці размаўлялі, то яна запытала: «Бачыў, які закат сёньня быў? Нібы выбух у аблоках?» Мы бачылі яго ў небе аднолькава, знаходзячыся на адлегласьці болей чым у трыццаць кілямэтраў адно ад аднаго. Пад тым закатам, праз поле, знаходзілася вялікая вёска. Калі дзень пачаў паміраць, нарадзіліся сотні дробных памаранчавых і сініх агеньчыкаў — запаліліся ліхтары. Калі дзень памёр, на небе запаліліся ў сотні тысяч, мільёнаў болей жыцьцяў-агеньчыкаў — зоркі. Простае разуменьне, здавалася б, — бязь сьмерці не бывае жыцьця.

Мы забыліся на павагу. Катастрафічны падзел на дабро і зло, на добрае і дрэннае... Павага — гэта дзеяньне. Мы наляпілі цэтлік «дрэнна» на холад, голад, хваробы. Але ўсе праблемы ад галавы. Калі холад — гэта холад, без дрэнна і добра, проста ўкладаеш рукі ў рукавы муфтай і йдзеш хутчэй, хутчэй дасягаеш пастаўленай мэты. Калі стомленасьць — проста стомленасьць, можна надаць ёй розную значнасьць у дарозе — хутчэй перастаўляеш ногі туды, дзе знойдзеш нешта яшчэ акром яе, што будзе важней для цябе, і адчуеш сапраўдную каштоўнасьць знойдзенага.

Павага — прыняцьце сьвету. Безь яго разбурэньня, без разбурэньня таго, што не заўсёды намі створана, але што мы можам прыняць ці зьмяніць пад сябе ў сваім сьветапоглядзе. Колькі зьяваў у жыцьці мы назвалі дрэннымі, лічачы, што іх не павінна быць. Не павінна быць болей за палову жыцьця? А як жа славутыя «да ста год»? Як жа часы, здадзеныя без змаганьня, яскравага, захапляючага, памятнага блізкім, на смяротным ложы? На парозе таго, без чаго немагчыма жыцьцё? Дзе ж славутая беларуская гасьціннасьць?..

Чытаючы навуковыя ці мастацкія кнігі па міталёгіі, няцяжка заўважыць, чым жа было старажытнае беларускае паганства — пакланеньне, як мы гэта завем, камяням, рэкам, розным істотам — русалкам, лесавікам, ба-

лотнікам... Прыняцьце сьвету такім, які ён ёсьць, як ён дазваляе карыстацца і жыць побач ці ў сабе. Таму, калі я перачытваў у кнізе Ўладзіміра Арлова «Таямніцы полацкай гісторыі» паганскую малітву славян, дзе распавядалася аб сьвеце як аб добрым і злым, я пагадзіўся з тымі, хто лічыць яе містыфікацыяй. Паганства — прыняцьце ўсяго сьвету з усімі яго існымі і іх ролямі; нечым нават слова пераклікаецца з павагай...

Сьмяротны выбух вялікага сьвятла ў небе, што, павольна паміраючы, зьмяняў адценьні фарбаў, на фоне якіх, нібы песьцячыся ў саграваўльна-цёплага колеру коўдры, зараджаліся дробненькія жыцьці, я пабачыў на роўнай асфальтаванай шашы. На шляху, які адной сваёй выразнасьцю, проста гледзячы ў вочы, паказваў, хто зьяўляецца на гэтай дарозе лепшым спадарожнікам. Мне было дадзена пакаштаваць ледзянога жаху калегіюму, паралізуючай панікі ў начным лесе, адчуваньня жыцьця ў жывых сьлядах даўно памерлых продкаў, назіраць палёт жураваў і крумкачоў, па тым самым небе і паветры, у якіх гэта ўсё адбывалася і ў якіх гэта знаходзіцца. Розныя людзі на маім шляху — ніводнага лішняга: калегі, сябры, знаёмыя, суразмоўцы, «задалбатары», супрацоўнікі ворганаў... Зьявы — але кропкай, што растлумачыла перамогі, адыходы, адчуваньні, стала менавіта павага да іх.

*2017*

# ЗМЕСТ

Уступ ........ 3
Як я канчаткова нарадзіўся ........ 6
Езуіцкі калегіюм ........ 12
Куды цякуць рэкі? ........ 21
Першае выпрабаваньне ........ 27
«Пачуцьцё вайны» ........ 30
Адчуваньне прысутнасьці ........ 34
«Дуркуватыя прыехалі» ........ 38
Вясковыя і гарадзкія ........ 45
Людзі, вывіхнутыя з соцыюму ........ 51
Прыручыць страх ........ 57
«Хабар» ........ 66
Стэрэатыпы аб капальніках ........ 71
Сьметніцы адкрываюць усе таямніцы ........ 78
«Гарышча» ........ 83
Гістарычныя каштоўнасьці ........ 85

*На вокладцы выкарыстана карціна Тацяны Козік «Ня ў нас усё — але праз нас».*

*Літаратурна-мастацкае выданьне*

**Стома** Іван

# Па жывых сьлядах даўно памерлых продкаў

*Палявыя нататкі капача*

Адказны за выпуск *Алесь Аркуш*
Рэдактар *Людміла Шчэрба*
Кампутарная вёрстка *Ларысы Гарадзецкай*
Карэктар *Людміла Шчэрба*

Падпісана ў друк 05.07.2017. Фармат 84×108 $^1/_{32}$.
Папера афсэтная. Рызаграфія.
Ул.-выд. арк. 3,21. Ум. друк. арк. 5,88.

Выдавецкая ініцыятыва «Полацкае ляда».

Printed in Poland.

Agencja Wydawnicza EkoPress.

ISBN 978–83–62069–61–3



Іван Стома нарадзіўся ў 1992 годзе ў горадзе Наваполацку. Дзяцінства правёў часткова ў горадзе, часткова – у вёсцы Астравенец Ушацкага раёну. У чацьвертай клясе захапіўся полацкай гісторыяй і пачаў свае самастойныя дасьледаваньні, удзельнічаў у розных конкурсах, алімпіядах, археалягічных раскопках, якія ладзіліся ПДУ. У дванаццаць гадоў упершыню патрапіў у полацкія лёхі. Скончыў наваполацкую СШ №8. Працаваў грузчыкам, сацпрацаўніком, натуршчыкам у ПДУ.

Піша вершы і прозу. Зараз жыве ў Санкт-Пецярбургу.

Іван Стома

Па жывых сьлядах даўно памерлых продкаў